View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ПАЭЗІЯ

На вывучэнне тэмы адводзіцца 7 гадзін. З іх на агляд, прысвечаны асноўным тэндэнцыя у развіцці паэзіі можна адвесці 1 гадзіну. У «Прыкладным каляндарна-тэматычным планаванні» да першай гадзіны **«Паглыбленне агульначалавечага, маральна-філасофскага, гуманістычнага зместу лірыкі (агляд)»** падаюцца наступныя мэты «Дапамагчы вучням асэнсаваць літаратурны працэс у Беларусі на сучасным этапе, паглыбіцца ў свет паэтычных твораў, пазнаёміць старшакласнікаў з новым пакаленнем творчай моладзі, літаратурнымі часопісамі і публікацыямі ў іх твораў сучасных аўтараў; раскрыць тэматычнае багацце і жанравую разнастайнасць сучаснай паэзіі (на прыкладзе творчасці двух трох аўтараў); садзейнічаць развіццю мастацкага густу, слоўнікавага запасу, вучыць чытаць, успрымаць і інтэрпрэтаваць паэтычныя творы; стварыць умовы для духоўнага ўзбагачэння, фарміравання самасвядомасці і маральнага самавызначэння вучняў».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пры вывучэнні гэтай тэмы пажадана звярнуць увагу на наступныя пытанні:

1. Асаблівасці літаратурнага працэсу на сучасным этапе: асноўныя грамадска-гістарычныя падзеі, тэндэнцыі агульнакультурнага і літаратурнага развіцця, звесткі пра пісьменнікаў, у творчасці якіх знайшлі ўвасабленне актуальныя для разглядаемага перыяду праблемы і тэмы, найбольш значныя творы (можа прыводзіцца іх кароткі аналіз).

2. Прадстаўленасць сучаснай паэзіі шматлікімі пісьменніцкімі пакаленнямі.

3. Паглыбленне агульначалавечага, маральна-філасофскага, гуманістычнага зместу лірыкі, яе грамадзянска-публіцыстычнага і інтымна-псіхалагічнага пачаткаў у сучаснай паэзіі.

4. Чарнобыльская тэма ў сучаснай беларускай паэзіі (Я. Сіпакоў «Одзіум»), М. Мятліцкі (зб. «Бабчын», «Палескі смутак»), А. Зэкаў (з. «Чарнобыльскі вецер»), М. Башлакоў (зб. «Пяро зязюлі падніму»).

5. Урбаністычныя матывы ў сучаснай паэзіі (А. Глобус, Л. Дранько-Майсюк, Г. Багданава, Г. Булыка і інш.).

5. Пошукі і наватарства ў галіне паэтычнай формы (М. Танк, А. Разанаў і інш.).

5. З’яўленне ў літаратуры новых імёнаў: М. Башлакоў, М. Шабовіч, Л. Рублеўская, В. Шніп і інш.

Перад вывучэннем тэмы варта даць апераджальнае дамашняе заданне: падрыхтаваць рэфераты на наступныя тэмы «Жанравы стан сучаснай беларускай лірыкі», «Мой любімы сучасны паэт», «Тэмы і праблемы сучаснай беларускай паэзіі».

Асноўным метадам працы на ўроку будзе лекцыя настаўніка, якая спалучаецца з эўрыстычнай гутаркай, дыспутам, самастойнай працай вучняў (рэфераты, канспекты, праца па падручніку), выразным чытаннем урыўкаў з паэтычных твораў, можна выкарыстаць абарону праектаў ці справаздачы творчых груп па апераджальных заданнях

Структура тэмы павінна выглядаць наступным чынам:

— называецца эпоха, указваюцца яе часавыя межы;

— даецца агульная характарыстыка грамадска-палітычнага жыцця (пазначаюцца важнейшыя падзеі, па магчымасці гаворыцца пра іх адлюстраванне ў мастацтве);

— раскрываецца адметнасць культуры дадзенай эпохі (тэатр, музыка, жывапіс і інш.);

— характарыстыка літаратурнага працэсу (літаратурныя школы, кірункі, плыні, стылі, жанравая і тэматычная разнастайнасць, найбольш значныя імёны, творы);

— разгляд творчасці асобных пісьменнікаў.

Можна выкарыстаць таксама тэматычна-праблемны прынцып:

— філасофскі напрамак у сучаснай паэзіі, пошукі новых жанраў і форм твораў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— інтымная лірыка, яе разнастайнасць, паглыбленне псіхалагічнага пачатку;

— грамадзянская паэзія на сучасным этапе;

— асэнсаванне чарнобыльскай тэмы ў сучаснай беларускай паэзіі;

— урбаністычныя матывы ў сучаснай паэзіі.

**Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на прадстаўленасць сучаснай паэзіі шматлікімі пісьменніцкімі пакаленнямі**: побач з такімі класікамі, як Пятрусь Броўка, Максім Танк, Пімен Панчанка, Аркадзь Куляшоў узніклі постаці будучых вядомых паэтаў Аляксея Пысіна, Міколы Аўрамчыка, Аляксея Русецкага, Сяргея Дзяргая, Ніла Гілевіча, Алега Лойкі, Міколы Арочкі. Услед за імі сцвердзілі сябе ў літаратуры такія таленавітыя і такія розныя паэты, як Рыгор Барадулін, Уладзімір Караткевіч, Генадзь Бураўкін, Анатоль Вярцінскі, Пятрусь Макаль, Васіль Зуёнак, Данута Бічэль-Загнетава, Юрась Свірка, Мікола Купрэеў, Алесь Наўроцкі, а неўзабаве з’явіліся яркія постаці: Алесь Разанаў, Яўгенія Янішчыц, Уладзімір Някляеў, Сяргей Законнікаў, Леанід Дранько-Майсюк, Леанід Галубовіч, Раіса Баравікова, Таіса Бондар, Анатоль Сыс, Мікола Шабовіч. Самая маладая генерацыя маладых літаратараў прэзентавана імёнамі Віктара Жыбуля, Андрэя Хадановіча, Вікі Трэнас, Алеся Аркуша, Усевалда Гарачкі і іншых літаратараў.

На сучасным літаратурным працэсе пазітыўна адбіўся і актыўны ўдзел у ім моладзі, стварэнне ёю творчых суполак. Калі старэйшыя пісьменнікі пераважна з’яўляюцца прыхільнікамі рэалістычнай творчасці, дык моладзь больш хінецца да мадэрнізму і постмадэрнізму, сучаснага авангарду, што ідзе з Захаду і з Расіі, адмаўляе многія ранейшыя пазітыўныя каштоўнасці і гармонію стылю, аднак падштурхоўвае літаратараў да эксперыменту як у галіне зместу, так і ў галіне формы. Найбольш плённымі з’яўляюцца ў нашы дні, як думаецца, ідэйныя і вобразныя пошукі паэтаў, празаікаў, драматургаў і крытыкаў, якія стварылі ў 1987 годзе літаратурную суполку «Тутэйшыя» (А. Асташонак, П. Васючэнка, А. Глобус, С. Кавалёў, А. Сыс, М. Шайбак і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

іншыя) і выступілі супраць «манапалізму Саюза пісьменнікаў на кіраванне літаратурным працэсам, патрабуючы стварэння новых, больш гнуткіх мастацкіх іерархій, у якіх бы знаходзілася месца не толькі «літаратурным генералам», але і таленавітай моладзі». Творчасць маладых літаратараў была пераважна зарыентаванана на нацыянальныя каштоўнасці, створаныя класікамі нашага слоўнага мастацтва – Францішкам Багушэвічам, Янкам Купалам, Максімам Багдановічам, Максімам Гарэцкім і Уладзімірам Караткевічам (які, дарэчы, лічыўся імі апошнім носьбітам нацыянальнага ідэалу).

Напрыканцы мінулага стагоддзя (1993 г.) было створана «Таварыства вольных літаратараў» (І. Сідарук, А. Аркуш, Л. Сільнова, Л. Сом і інш, мастацкая праграма якога зводзілася да адмаўлення ранейшых традыцый і выпраўлення памылак папярэдняга літаратурнага таварыства, а таксама да адмаўлення культурнага цэнтрызму сталіцы.

У 1995 годзе з’явіўся новы літаратурны рух – «Бум-Бам-Літ» (Зм. Вішнёў, С. Мінскевіч, А. Туровіч, В. Жыбуль і інш.). Творчасць паводле тэорыі і практыкі гэтага таварыства павінна адмовіцца ад класічнага жанрава-тэматычнага аблічча і пазітыўнага пачатку ўвогуле, уяўляць сабой своеасаблівую эпатажную самапрэзентацыяю аўтараў, слова якіх атрымала б права на існаванне па-за тэкстам, па-за перадачай інфармацыі.

**Пытанне пра паглыбленне агульначалавечага, маральна-філасофскага, гуманістычнага зместу лірыкі, яе грамадзянска-публіцыстычнага і інтымна-псіхалагічнага пачаткаў** варта разгледзець на творчасці А. Куляшлва, М. Танка, П. Панчанкі, А. Вярцінскага Л. Дранько-Майсюка, Р. Баравіковай і інш.

XX стагоддзе прайшло пад знакам няспынных эксперыментаў у слоўным мастацтве, перш за ўсё ў лірыцы (сімвалісты, футурысты, акмеісты, імажыністы, за імі мадэрністы і постмадэрністы). Рабіліся нават актыўныя спробы стварэння «навуковай паэзіі» як апанента пачуццёвай словатворчасці, эмацыянальнасці — найважнейшага кампанента, нязменнага складніка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мастацка-вобразнага мыслення. Вынікам барацьбы дзвюх тэндэнцый у мастацтве слова і сталася лірыка М.Багдановіча, А.Куляшова, М.Танка, Я.Сіпакова, А.Вярцінскага, А.Разанава ды іншых аўтараў. Іх слоўная творчасць адметная сінтэзам думкі і пачуцця, адзінствам канкрэтнага і абстрактнага. «Аб'ектывізм» выяўленчасці і апісальнасці дапаўняецца ў падобнай паэзіі разважлівасцю, роздумам, а пачуццёвы пачатак падпарадкоўваецца разумоваму, набывае выразныя абрысы, бярэцца ў берагі разважлівасці, мэтазгоднай прастаты і сіметрыі. Як у «Новай кнізе», «Хуткасці», у вершы А. Куляшова, што даў назву другому зборніку:

Ёсць хуткасць гуку, ёсць — звышгукавая,
Ёсць хуткасць зор, прыкметная для ўсіх.
Яшчэ ёсць хуткасць думкі, хуткасць тая,
Што, як святло, стагоддзе абганяе,
З тысячагоддзем размаўляе ўслых.
О, таямніца кніг, скажы, з якіх
Людскіх глыбінь ты цуда здабывала?

Такім чынам, А. Куляшоў больш давярае думцы, чым пачуццю, стварае своеасаблівы культ яе, імкнецца пераступіць за мяжу пачуццёвага. Але аўра пачуццёвага пафасу застаецца: лірычны герой страсна перажывае такую сітуацыю, пры якой мастак аказваецца абмежаваны ў сваіх магчымасцях пазнання сакрэтаў жыцця і перадачы іх з дапамогай слова (у А. Куляшова яшчэ з аднаго кавалака верша «Хуткасць» гэта асабліва вынікае): «Твой зачынальнік слоў не знаў і мала // Свет разумеў, не меў матык і сох, // Маўчаў, як сом, пакуль бяда не ўзяла // За шчэлепы яго і на пясок // Не кінула, пакуль сярод начы // Яго душы нямой, сканаць гатовай, // Не загадала: — Дыхай, плач, крычы, // Нябыт цяжкі пазбудзь не рыб'яй мовай!».

Працэс паэтызацыі разгортвання думкі ў філасофскай лірыцы А.Куляшова не завяршыўся. Цяпер склаўся варыянт творчасці, у якой адбываецца як агульная актывізацыя мысліцельнай энергіі, так і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

канцэнтрацыя пачуцця, дзякуючы яскравай выяўленчасці, трапнасці мастацкіх дэталяў і ўдала знойдзеным слоўна-выяўленчым сродкам.

Сярод паэтаў-філосафаў Беларусі адно з першых месц належыць Максіму Танку, які адрозніваецца ад А. Куляшова больш яскравым імкненнем засвоіць традыцыі сусветнай літаратуры (верлібр, паглыбленая асацыятыўная вобразнасць), разбурыць класічныя каноны, надаць вершам большую прытчападобнасць. Яго філасофская лірыка ўяўляе сабой вышэйшы этап руху мастацкай творчасці беларусаў да інтэлектуалізацыі, пераразмервання суадносін паміж «рацыё» і «эмоцыё». Пачуццё ў многіх творах паэта 1980 — 1990 гг. выяўляецца стрымана, строга і стройна, «падтэкстава»:

Лістаю рэшткі дзённіка,
Якога многія старонкі
То пашматаў
Прапахлы порахам і дымам вецер,
То пайшлі на самакруткі,
То на распал
Суркоўскай франтавой пячуркі…
Хоць ведаю, што іх не аднавіць,
Працягваю блукаць
Па сваіх снах,
Па замініраваных сцежках
Успамінаў.

Максім Танк арыентуецца на павучальнасць, эталагізм не толькі «ўнутранага», але і «знешняга» парадку: форма яго твораў падпарадкоўваецца доказнасці і набывае лагічную стройнасць і строгасць. Многія вершы паэта ўяўляюць сабою разгорнутыя развражанні з самім сабой і з апанентамі, суразмоўцамі — зямлёй і небам, сонцам і зорамі, дрэвамі і рачнымі хвалямі, звярамі і птушкамі і — вядома — людзьмі. Размеранасць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гутарковасць — адметнасць эталагічнай разнавіднасці філасофскай лірыкі, якую прадстаўляюць М. Танк, А. Вярцінскі, у пэўнай ступені П. Панчанка.

Новае, больш шырокае гучанне ў творчасці паэтаў атрымлівае зараз адраджэнская тэматыка, якая становіцца дамінантнай у многіх вершах Пімена Панчанкі, Максіма Танка, Ніла Гілевіча, Васіля Зуёнка, Генадзя Бураўкіна, Сяргея Законнікава. Паэты ствараюць мастацкі свет, у цэнтры якога стаіць чалавек-мысліцель, філосаф, палітык, публіцыст, грамадзянін, які клапоціцца пра лёс Бацькаўшчыны. Узмацненне грамадзянскай скіраванасці сучаснай беларускай паэзіі звязана з трывожным станам у адносінах да роднай мовы, занядбаннем нацыянальных традыцый напрыканцы ХХ – у пачатку ХХІ стагоддзя. Так, апошнія творы Пімена Панчанкі засведчылі працяг традыцый грамадзянскай беларускай лірыкі на новым узроўні (вершы «Развітанне», «Ратуйце нашы душы!»). Элегія «Развітанне» напоўнена горкім расчараваннем, непрыхаваным і шчымлівым болем, зняверанасцю лірычнага героя ў адраджэнне роднай мовы, якога адлучылі ад родных слоў і Бацькаўшчыны (*«Мы забылі пра вольнасць // Старажытных сваіх гарадоў»*). Твор П. Панчанкі заснаваны на мастацкай інтэрпрэтацыі і асуджэнні падзей, у выніку якіх многім народам было адмоўлена ў праве «людзьмі звацца» велікадзяржаўнымі шавіністамі і праваднікамі палітыкі сталінскага генацыду ў адносінах да малых народаў, а таксама бяздумнымі адносінамі да беларускіх земляў і мовы (*«Вучы дзяцей французскай, // Ангельскай, // Эсперанта, // Але не беларускай»*). У канцы твора аўтар выходзіць на адкрытую палеміку з Янкам Купалам, які ў пачатку ХХ стагоддзя верыў у адрадженне беларускага народа, з горыччу сцвярджаючы: *«Родны Янка Купала, // Вы пісалі: // «Я веру – настане...» // Дарагі мой Іван Дамінікавіч, // Не, не настане! // Гэта ўжо не світанне, // Гэта наша настане змярканне, // Гэта з мовай маёй, // Гэта з песняй маёй // Развітанне»*.

Трэба адзначыць, што названы верш Пімена Панчанкі выклікаў неадназначную ацэнку літаратараў, асабліва маладых. Так, у форме адкрытай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

палемікі напісаны верш Анатоля Сыса «Прачытаўшы верш Пімена Панчанкі «Развітанне», прасякнуты абурэннем і горыччу за заўчаснае развітанне з мовай, адмаўленнем падобнага песімістычнага погляду на нацыянальна-культурнае адраджэнне: *«Родны мой Пімен Панчанка, // Вы сказалі: настала змяркание? // Вы сказалі на маці мачыха? // Бо настала Вам развітанне? // […] Адыходзіце ці зракаецеся? // Ці сухімі слязамі каецеся? // Пад крыжамі Сафіі Полацкай // бюракрат за Вас не памоліцца, // а памоліцца за Вас мачыха <...>».*

Менавіта ў сучасны перыяд развіцця літаратуры ўзмацняецца цікавасць паэтаў і празаікаў да гістарычнага мінулага як асновы фарміравання гістарычнага пачуцця. Таго пачуцця, што ператварае чалавека ў грамадзяніна, які пачынае клапаціцца не толькі пра свой асабісты лёс, але і за лёс сваёй краіны. Даследчык сучаснай паэзіі А.І. Бельскі так тлумачыць з’яўленне і ўзмацненне гістарычнага фактару мыслення ў беларускай паэзіі: «Сучасных паэтаў найперш прыцягвае лёс знакамітых людзей Беларусі – тых, хто стаяў ля вытокаў нашай дзяржаўнасці, культуры, асветніцтва, адраджэння, хто ўласнай мужнасцю, патрыятычнай ахвярнасцю, вялікім талентам, пакутніцкім жыццём упісаў сваё імя на скрыжалях гісторыі. Мацярык мінулага ў паэтычным адлюстраванні зрабіўся шматнаселеным: аб'ектам услаўлення нашых паэтаў-сучаснікаў з'яўляюцца Еўфрасіння Полацкая, Рагнеда, князь Вячка, Кірыла Тураўскі, князь Вітаўт, Ф. Скарына, М. Гусоўскі, Л. Сапега, С. Будны, К. Каліноўскі, П. Багрым, Ф. Багушэвіч, Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, Цётка (А. Пашкевіч), Я. Драздовіч, У. Дубоўка...». Гістарычная тэматыка ў літаратуры на сучасным этапе годна прадстаўлена зборнікам «Кніга ўзнаўленняў» Алеся Разанава – своеасаблівай энцыклапедыяй складанай гісторыі Беларусі. Паэт стварае літаратурныя наследаванні адкрытай дыдактычнай накіраванасці, перакладае на сучасную літаратурную мову творы, напісаныя знакамітымі асветнікамі, рэлігійнымі і дзяржаўнымі дзеячамі (Кірылам Тураўскім, Францыскам Скарынай, Сымонам Будным, Васілём Цяпінскім, Іпаціем Пацеем, Язэпам Руцкім,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Кірылам Траквіліён-Стаўравецкім, Мялеціем Сматрыцкім, Львом Сапегай), якія павучаюць нашчадкаў людзьмі звацца, *«жыць // у айчыне сваёй бяспечна // і не баяцца»*, вершамі А. Пісьмянкова, баладамі В. Шніпа.

Лірыка кахання вызначае творчае аблічча Р. Баравіковай: назвы яе кніг выразна аб гэтым сведчаць – «Слухаю сэрца», «Каханне», «Пад небам першага спаткання», «Люстэрка для самотнай». Яе вершы вельмі эмацыянальныя, поўныя экспрэсіі, выказваюць жаданне паэтэсы кахаць і быць каханай, яе парыў да ідэальнага, незямнога пачуцця. У драматычных паэмах «Барбара Радзівіл» і «Саламея» пра рэальных гістарычных асоб, створаны вобразы жанчын, апантаных каханнем, якія ставіць гэта пачуццё вышэй за ўсё на свеце, для іх нішто ўлада, багацце, спакой.

На думку некаторых даследчыкаў, новай рысай сучаснай паэзіі «стаў зварот беларускіх паэтаў да рэлігійна-хрысціянскай і біблейска-філасофскай тэматыкі. <…> Імя Бога вярнулася ў нашу паэзію як сімвал духоўнага выратавання і заступніцтва. Бог, пошук Боскага ў чалавечым існаванні, прага ачышчэння, чалавекалюбства, далучэнне душы да вечнага, хрысціянскага, усяго святога – вось тое кола матываў, якое вызначае змест твораў рэлігійна-духоўнай скіраванасці». Адной з асаблівасцей новай мастацкай свядомасці з’яўляецца адчуванне майстрамі слова адсутнасці ярка выражанага памежжа паміж Жыццём і Смерцю. І ў сувязі з гэтым многія сучасныя аўтары, такія як А. Разанаў, Р. Барадулін, І. Багдановіч, Д. Бічэль, М. Шайбак, А. Мінкін, А. Глобус і іншыя, разглядаюць смерць не толькі і не столькі як фізіялагічны канец чалавека, а як своеасаблівы пераход яго ў іншае жыццёвае вымярэнне. падобнае тлумачэнне сутнасці смерці, выкліканае эсхаталагічным настроем, уласцівае постмадэрнісцкаму напрамку светавай, у тым ліку і беларускай, літаратуры ў цэлым. Адно з асноўных месцаў у лірыцы паэтаў паступова займае малітва-зварот да Бога з просьбай выратаваць Беларусь, «дараваць грахі, даць годны лёс беларускаму народу», адрадзіць, дапамагчы і падтрымаць Радзіму: *«Над бацькаўшчынай сумнай і прыгожай, //*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Зачараванай чарам летаргіі, // Прыадчыні аблік твой светлы, Божа, // Праліся ў душы тайнай літургіі»* (І. Багдановіч).

**Чарнобыльская тэма ў сучаснай беларускай паэзіі (Я. Сіпакоў «Одзіум»), М. Мятліцкі (зб. «Бабчын», «Палескі смутак»), А. Зэкаў (з. «Чарнобыльскі вецер»), М. Башлакоў (зб. «Пяро зязюлі падніму»).** Тэматычны дыяпазон сучаснай беларускай паэзіі не абмяжоўваецца акрэсленымі вышэй тэмамі. Адным з дамінантных пытанняў, якому прысвячаюць свае творы паэты, становіцца пытанне пра выдаткі НТР, наступствы аварыі на Чарнобыльскай АЭС (зборнікі М. Мятліцкага «Бабчын», «Чаканне сонца», В. Зуёнка «Лета трывожных дажджоў», «Чорная лесвіца», вершы М. Танка «Просьба аб дараванні», «Тут Беларусь была», Р. Барадуліна «На схіле двухтысячагоддзя» інш.). Даследчык сучаснай паэзіі Л. Гарэлік так вызначае ўплыў тэхнагенных катастроф і прыродных катаклізмаў на мастацкую творчасць паэтаў: «Постчарнобыльская эра прынесла непрадказальныя змены ў грамадскую свядомасць, прымусіла задумацца і пераканацца, што пісаць так, як раней, не пажадана. Ці можна пасля Чарнобылю ўвогуле займацца вершатворчасцю, марыць пра высокія матэрыі?», паэты адчуваюць сваю асабістую далучанасць да лёсу роднага краю, немагчымасць як раней пісаць радасныя і светлыя вершы пра прыроду: *«Нават у мройлівыя // зорныя ночы // светлыя вершы // прыходзіць не хочуць»*.

**Урбаністычныя матывы ў сучаснай паэзіі (А. Глобус, Л. Дранько-Майсюк, Г. Багданава, Г. Булыка і інш.).**

Далейшае развіццё і тэматычнае пашырэнне сучаснай беларускай паэзіі адбылося і за кошт абнаўлення урбаністычнай тэматыкі, што можна патлумачыць прыходам у літаратуру новай генерацыі мастакоў, які нарадзіліся ў горадзе. Тут можна вылучыць вершы Адама Глобуса з кніг «Парк» і «Скрыжаванне» – «Горад», «На прыпынку», «1989. Мінск. Траецкае прадмесце», «1939. Вільня. Слова беспрацоўнага», «Беларускія краявіды», якім характэрна аўтарская «ўвага да дэталі, імкненне вылучыць дакладны абрыс, знайсці ў бачным, хуткаплынным сутнаснае, вечнае». А. Глобус з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дапамогай штрыхоў-вобразаў (афішы, новабудоўлі, хлапечае жыццё мікрараёнаў, транспарт і г.д.) стварае цэласную, гарманічную карціну гарадскога жыцця, у якой лірычны герой адчувае сябе ўтульна і спакойна: *«Афішы, перахрышчаныя клеем, // Чытаюцца дзяўчынкай па складах. // Новабудоўлі моцна пахнуць клеем, // Вартаўнікі сумуюць пры складах. // Хлапечае жыццё мікрараёнаў // Заблыталася ў бітумнай смале. // Будзільнікам зялёным, электронным // Міргае вока часу на стале»* .

Некаторыя сучасныя паэты ўспрымаюць горад не толькі як чыстую крыніцу пачуццяў, успамінаў і перажыванняў, сведку іх маленства, юнацтва і першага кахання, але і як жорсткі, бяздушны свет, атулены прывіднымі сценамі змроку, «месца», дзе валадарыць халодны вецер (вершы Галіны Булыкі са зборніка «Турмалін», Галіны Каржанеўскай з кнігі «Асенні мёд», Людмілы Рублеўскай са зборніка «Замак месячнага сяйва»): *«Гарадскім скразнякам не хапае прасторы // Размахнуцца ў вятры, // Замахнуцца на лёс. // Перспектывы праектаў // Развейвае горад // На няўтульны бясконцы крыштальны мароз»*; *«Паламаныя лаўкі // прыгожа засцеле лістота, // Паламаныя лёсы // прымірацца з болем глухім. // Гэта – восень зямлі, // гэта жоўтая песня самоты. // Гэта – вочы шкляныя праспекта // і цемра над ім»*. Падобны элегічна-тужлівы, часам нават трагедыйны настрой урбаністычнай лірыкі большасці паэтак тлумачыцца найперш спустошанасцю і здрабненнем чалавечых душ напрыканцы мінулага стагоддзя.

**Пошукі і наватарства ў галіне паэтычнай формы (М. Танк, А. Разанаў і інш.).** У апошні час усё больш шырокую прастору ў сучаснай паэзіі заваёўваюць монастрафічныя, нерыфмаваныя вершы. Развіццю форматворчага эксперыменту ў нашай краіне паспрыяла актывізацыя грамадска-культурнага жыцця ў апошнія два дзесяцігоддзі XX стагоддзя. Стварэнне новых codeвершаваных формаў набыло зараз амаль масавы характар, у выніку чаго з’явіліся іх лепшыя ўзоры, заявілі пра сябе вершаказы, квантэмы, пункціры, хоку, танка Алеся Разанава і іншых аўтараў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З імем А. Разанава звязана наша ўяўленне аб пошуку паэзіяй новых шляхоў, незвычайных форм, арыгінальных жанраў і стыляў. У яго асобе спалучаюцца рысы паэта-наватара, эксперыментатара, вечнага шукальніка ісціны, моватворцы, генератара новых творчых ідэй, а ў паэтыцы пераважае імклівасць рытму, ускладненая метафарычнасць. У кнігах А. Разанава выявілася непаўторнае непадабенства і арыгінальнасць стылю, абумоўленая не толькі наватарствам фармальных пошукаў мастака, але зместам твораў: гістарызмам погляду на рэаліі свету, медытатыўнасцю і філасафічнасцю, асацыятыўнасцю мыслення. Пачынаючы са сваёй першай кнігі, А. Разанаў шукае новыя, нетрадыцыйныя для беларускай паэзіі формы верша – пункціры, квантэмы, версэты, вершаказы, зномы.

Першымі ў творчасці Алеся Разанава з’яўляюцца пункціры – невялікія (часцей 4-6 радкоў) лірычныя мініяцюры, выкананыя па законах тонкай графікі, сфакусаваныя на перадачы адной думкі, фіксацыі аднаго пачуцця. Пункціры знешне нагадваюць хоку, але не маюць дакладных правілаў стварэння, у іх рэалізуецца глыбокі філасофскі змест, іх кампазіцыя ставіцца ў прамую залежнасць ад выкарыстання дамінантнай дэталі: *«Куды? Адкуль?.. – // маўчанне... // Не дасць адказу час. // Стаю – і сам* ***пытанне****, іду – // і сам адказ»*. Квантэмы («квант паэтычнай энергіі» (Я. Гарадніцкі)) – незавершаныя, недасказаныя паэтычныя творы, якія характарызуюцца перарывістасцю думкі, своеасаблівы імпульс да сатворчасці: *«сам-насам з незавершанасцю // што // пярэчыць перамогам // бездань ззаду»*. Звычайна падобны твор пачынаецца з малой літары і не мае знакаў прыпынку.

Версэт – адна з самых распаўсюджаных у творчасці А. Разанава вершаформ – «напісаны прозай невялікі лірычны твор, які сваёй вобразнасцю, павышанай эмацыянальнасцю і своеасабівай рытмічнасцю набліжаецца да паэзіі. В. – гэта, па сутнасці, твор паэтычны па змесце і празаічны па форме выяўлення гэтага зместу». Версэт – твор прытчавага, павучальнага характару, у якім па-філасофску глыбока пераасэнсоўваецца свет звычайных рэчаў і паняццяў: *«Я чую шмат слоў. // Бачу мноства*

*людзей. // Усе яны кажуць, што трэба адрозніваць няшчырасць ад шчырасці, уяўнасць ад праўды, намер ад здзяйснення, клопат пра аднаго сябе ад клопату пра ўсіх іншых... // Але цяпер зіма. // І словы, і людзі, і ўсё наваколле захутаны ў шэрань. // І сухадрэвіны не адрозніваюцца ад дрэў»*. У працытаваным версэце «Шэрань» паэт асэнсоўвае ўяўныя і сапраўдныя каштоўнасці, якімі кіруецца чалавек ў жыцці. Апошні сінтаксічны перыяд утрымлівае важную філасофскую выснову: часам з-за шэрані правесці выразнае размежаванне паміж Дабром і Злом (пазітывам і негатывам) немагчыма, нягледзячы нават на тое, што «Не может дерево доброе приносить плоды худые, ни дерево худое приносить плоды добрые» (Ев. ад Мф.: 12 – 19).

Імкненнем наблізіць паэтычную мову да празаічнай, паглыбіць яе аналітызм вызначаюцца вершаказы – набліжаныя да прозы творы, у якіх рытмастваральнымі сродкамі выступаюць чаргаванне сінтаксічных перыядаў, паўторы, інверсі і аднолькавая (ці блізкая) будова фраз: *«Грошы шукаюць сховішчы, дзе б іх не бачылі чыйнія вочы, – ці прыгаршчы, ці гаршчок, ці гарышча, – і аб сабе не гавораць уголас, а калі рашаюцца гаварыць, то – шэпам, шоргатам...»*, і значымы – гнасеалагічныя адзінкі, якія выяўляюць погляд паэта на свет і быццё чалавека ў ім, на жыццё і смерць, гаротны стан мовы і бацькаўшчыны, на творчасць і мастацтва: *«Праз рознасць патэнцыялаў свядомасці звычайнай і надзвычайнай (прадбачання, інтуіцыі, натхнення) узнікае ток, што рухае думку, што жывіць творчасць»*. У працытаваным творы А. Разанава выяўляецца імкненне мастака ва ўсім дайсці да сутнасці з'яў, выявіць паходжанне і спецыфіку творчасці.

Паэзія А. Разанава характарызуецца «ўхілам» у бок рацыяналізму, доказнасці, асацыятыўнасці, мысленне мастака «ўшчыльняецца», ускладняецца за кошт нечаканых асацыяцый, жанра- і словатворчасці. Так з'яўляецца новы, надрэалістычны тып мыслення, амаль не ўласцівы беларускай літаратуры ХХ – пачатку ХХІ стагоддзяў, якім наша мастацтва слова пакуль што не авалодала напоўніцу. А. Разанаў сёння ўвесь у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

эксперыменце, пошуку новай вобразнасці і форм яе выяўлення: *« Мы не займаем ніякіх пасад і не маем ніякіх званняў, але якраз у гэтым усе, хто ведае нас і не ведае, бачаць нашу пасаду і разумеюць наш чын. <...> // «Я ніколі не каяўся ў тым, чаго не рабіў, але каяўся ў тым, што рабіў, але каяўся ў тым, што рабіў» – нам прысвячаюць свае высновы волаты думкі. // Sumus ne simus. // Мы ёсць, каб не быць…»*.

Папулярнасць у сучаснай паэзіі набывае і жанравая форма танка – монастрафічны пяцірадковы нерыфмаваны верш, у якім першы і трэці радкі маюць па пяць складоў, а астатнія – па сем. Класічная танка складаецца з 31 склада, а галоўная думка верша сканцэнтравана, як правіла, у трох першых радках. Сэнсава ўшчыльнены твор гэтай формы, які мы працытуем, пабудаваны на традыцыйным вобразным параўнанні чалавека з мятлікам, у ім сцвярджаецца тэзіс пра хуткаплыннасць жыцця чалавека: *«Пярэсты мятлік // і восенню хоча жыць – // п'е паспешліва // з хрызантэмы расінкі // марознай раніцай»* .

Шырокае распаўсюджанне ў сучаснай літаратуры атрымала і жанравая форма хоку (або хайку, хайкай) – монастрафічны трохрадковы верш, які вылучыўся з танкі і, па-сутнасці, з'яўляецца яе скарочанай формай. У хоку таксама адсутнічае рыфма, але строга захоўваецца дакладная колькасць складоў у вершарадах: у першым і трэцім – па пяць, у другім – сем. Гэта своеасаблівая цвёрдая вершаваная форма прыйшла да нас з японскай паэзіі, дзе яна актыўна ўжывалася яшчэ ў Сярэднявеччы. Максім Танк неаднаразова звяртаўся да падобнай жанравай формы (цыкл хоку са зборніка «Errata» – *«Хірасіма. На // Камені – цень чалавека. // Самога ж - няма»*), на сучасным жа этапе хоку ў беларускай літаратуры пішуць А. Глобус *(«Мытня на мяжы. // З маленькай сіняй хмары // раптам сьнег пайшоў»* (цыкл «Танку й хайку, напісаныя ў паветры ў дарозе зь Менску ў Маскву»)), Ул. Сіўчыкаў *(«Валошку згледзеў – // і рады той сустрэчы // у чужой староны»* (зб. «Высакосны год»)).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вынікі творчых пошукаў паэтаў абумовілі нараджэнне новых вершаваных формаў на стыку танкі і хоку – «ахвярынкі» (разважанні пра месца чалавека ў Сусвеце і Бога – *«У кожным // Адпаведна яго шчадраце // Бог расце»*) і «ясачкі» Рыгора Барадуліна. Так, напрыклад, «ясачкі» названага паэта адначасова па будове (монастрафа з трох радкоў) нагадваюць хоку (паўтанку), а па колькасці складоў – танку. Кожная з «ясачак» ўтрымлівае 31 склад, што характэрна менавіта для танкі, хоць па радках склады размеркаваны хаатычна: у адным выпадку іх – 9, 11, 11; у другім – 10, 11, 10: *«Скон – нечаканны й чаканны плён. // Чалавек – гадзіннік, які не ведае, // На колькі Усявышнім заведзены ён»*.

Эдуард Акулін адрадзіў і надаў новае дыханне газелі – віду монастрафічнага лірычнага верша, пабудаванага на 3 – 12 двухрадкоўях (бейтах) з рыфмоўкай **аа, ба, ва** і г.д. У апошнім бейце (макта) павінен згадваецца тахалус (імя, прозвішча ці псеўданім аўтара). Асаблівасць газелі заключаецца ў тым, што кожны бейт утрымлівае завершаную думку і мае адносна самастойнае значэнне: *«Галінка бэзу, траўнем надламаная, мая Каханая. // Ты лёсам мне, напэўна, звыш наканаваная, // мая Каханая. // Дзе б я ні быў, вяртаюся хутчэй // туды, дзе мне павек адданая, // мая Каханая. // У слоту лістападаўскіх начэй // са мной яна і восень не падманная, // мая Каханая. // Над беззданню даверлівых вачэй // мая маркота ў белы строй прыбраная, // мая Каханая»*.

Адраджэнне адной з нетрадыцыйных і новых для нацыянальнай паэзіі вершаваных форм – паліндрома – звязана з літаратурнай дзейнасцю Віктара Жыбуля, Сержа Мінскевіча, Пятра Васючэнкі і іншых аўтараў. Спробы стварыць паліндром – верш, які можа чытацца ў адваротным парадку (з апошняй літары (радка) да першай) без змен зместу ў нацыянальнай літаратуры звязана з імем Рыгора Крушыны, а на сучасным этапе непераўзыйдзеным майстрам падобнай вершатворчасці з'яўляецца Віктар Жыбуль са сваёй паэмай-паліндромам «Рогі гор»: *«У дар ураду – // замак, КАМаз, // ЗАЗ, // а дар урада – // шалаш...»*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вызначым яшчэ дзве новыя сучасныя вершаваныя формы, уласцівыя сучаснай беларускай паэзіі. Найперш гэта лімэрык (пяцірадкоўе, напісанае анапестам, у якім 1, 3, 5 радкі складаюцца з трох стопаў, а 2, 4 – з дзвюх з рыфмоўкай aabba). Змест кожнага радка ў падобным творы з’яўляецца рэгламентаваным: у першым адбываецца знаёмства з персанажам, у другім – паведамляецца пра яго дзеянне або асаблівасць (уласцівасць), трэці радок уяўляе сабой развіццё дзеяння, чацвёрты – развязку, а пяты – аўтарскую ацэнку героя. Заснавальнікам падобнай вершаформы («інтэлігенцкай частушкі») у нацыянальным слоўным мастацтве стаў Андрэй Хадановіч: *«Дэпрэсіўны паэт зь Беларусі // аб нядолі сьпяваў і нагрусе... // А пасьля землякоў // на пяць соцень радкоў // расьпісаў – і канец яго скрусе»*.

Другая вершаваная форма – пагер-вершы – кароткія тэкставыя паведамленні для пэйджэраў, пры напісанні якіх для эканоміі абмежаванай колькасці сімвалаў, не выкарыстоўваюцца знакі прыпынку, няма гукавога выражэння беларускіх «і», «ў», «ё», змест падобных твораў часцей складаюць інтымныя перажыванні лірычнага героя: *«я калышу тваю душу // ты спаць не хочаш да св1тання // маучу – 1 спадзяюся, яню // я у гэту ноч закалышу // я не магу – 1 не прашу // 1 проста шлю табе в1танн1 // тваю замерзлую душу // я памятаю дыхам яня»*.

**Акрамя змешчаных ў падручніку настаўнік можа прапанаваць наступныя пытанні і заданні:**

1. Ці ўласцівыя тэматычнае багацце і жанравая разнастайнасць сучаснай беларускай паэзіі?

2. Шлях Алеся Разанава – ад рэалізму да мадэрнізму. Ці разумееце, ці любіце вы такую паэзію?

3. Што можна сказаць пра паэзію Л. Дранько-Майсюка, А. Сыса, Я. Янішчыц, Т. Бондар? Якія яе тэматычныя рамкі? Які настрой яна выяўляе? Чым адрозніваецца ад паэзіі, створанай майстрамі слова старэйшых пакаленняў?

4. Падрыхтуйце вуснае паведамленне на адну з наступных тэм:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«Грамадзянская лірыка Ніла Гілевіча. Тэма сучаснасці ў ёй», «Максім Танк – майстар верлібра, паэт філосаф», «Алесь Разанаў і мадэрнізм», «Тэма памяці ў паэзіі Аляксея Пысіна».

**АНАТОЛЬ ВЯРЦІНСКІ (нар. у 1931г.)**

**Мэта ўрокаў:** спрыяць знаёмству вучняў з асноўнымі этапамі творчасці Анатоля Вярцінскага; дапамагчы вызначыць асноўныя кампаненты яго індывідуальнага стылю і жанравай палітры; праз мастацкі аналіз даследаваць асноўную праблему паэмы "Песня пра хлеб"; развіваць уменне вызначаць і характарызаваць тэму і ідэю твора; выхоўваць цікавасць да разумення і асэнсавання вечных праблем.

**Першы ўрок: Старонкі біяграфіі і творчасці пісьменніка. Стыль Анатоля Вярцінскага як адметная мастацкая сістэма.**

**Паапярэдняе дамашняе заданне:** Падрыхтаваць рэферат, прысвечаны жыццёваму і творчаму шляху Анатоля Вярцінскага.

**Дадатковы матэрыял да ўрока**

Анатоль Вярцінскі з'яўляецца адным з лепшых прадстаўнікоў «філалагічнага пакалення», школы высокага, засяроджанага на маральна-этычных праблемах, а значыцца – агульначалавечага мастацтва, таго яго адгалінавання, што арыентуецца на філасофскую творчасць, культывуе найперш думку, а затым – пачуццё.

У 1963 годзе паэт выказаўся пра два віды паказу рэчаіснасці, падобныя на спосабы апрацоўкі металу, – халодны і гарачы, падтрымаў з іх менавіта другі, гарачы, а халодны ахарактарызаваў як «строга супрацьпаказаны». І растлумачыў, чаму так лічыць: «Першы, рэгістрацыйна-інвентарызацыйны, дае фармальную, чыста знешнюю актуальнасць, стварае толькі выгляд яе, другі, даследча-творчы, дае актуальнасць сапраўдную». Як бачым, сам аўтар прызнаў асновай сваёй мастацкай творчасці, дамінантай сістэмнага пазнання свету ў мастацкіх вобразах даследча-творчы пачатак. Яго мастацтва – не павярхоўнае адлюстраванне ўбачанага, а ацэнка, пераацэнка, аналіз рэчаіснасці. Яму мала нейкую ісціну вызначыць, проста канстатаваць. Яму

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

трэба яе выразна акрэсліць, развіць на вачах чытача ў сапраўднае адзінства думак, звязаць зыходны тэзіс з іншымі, часам з асацыятыўным адценнем. Таму кожны верш паэта літаральна трымаецца на паўторах, на разгортванні філасофскага выказвання. Часцей за ўсё (у фальклорным стылі) тэзісы паўтараюцца тройчы. У гэтым заключаецца наватарства Анатоля Вярцінскага. Для доказу звернемся яшчэ да аднаго прыкладу – прывядзём цалкам невялікі верш паэта «Заканамернасць» з агульнай, абстрактнай, філасофскай назвай. Вершы з падобнымі назвамі – састаўная частка сістэмнага погляду паэта на свет – арганічна ўпісваюцца ў сканструяваную мастаком слова мадэль свету, драматычнага і складанага, у якім чалавек адчувае сябе не вельмі ўтульна, аднак не трымаецца недзе збоку, не з'яўляецца староннім назіральнікам за ўсім, што адбываецца на зямлі. Ды перад цытаваннем прывядзём некалькі характарыстычных загалоўкаў твораў Вярцінскага з кнігі выбранага «Хлопчык глядзіць…»: «Ваўкоў баяцца – у лес не хадзіць…», «Перасцярога», «Твая воля – як воля лёсу…», «Як узнікла ананімка», «Закон шчодрасці», «Выхад з тупіка», «Параўнанне». Вось, нарэшце, і радкі верша, кампазіцыя якога – класічная: казачная, прытчавая, трохчасткавая. Дзеля доказнасці паэт тройчы нанізвае адказ на пытанне, што ж такое заканамернасць у філасофскім значэнні гэтага слова:

Як бы ні слаўна паход пачаўся,
якім бы ён поступам ні вызначаўся,
на нейкай вярсце хтось прымажацца хітра,
выдасць сябе за неафіта.
Якой бы святой ні была тая троіца,
да троіцы хтось чацвёрты прыстроіцца.
Паверыш ты ў цуд, у белы камень –
А тут табе Іуда, а тут табе Каін.
Заззяе ідэя ў чыстым стане –
хтось тут жа прыліпне, прымкне, прыстане.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У прыгаданым вершы адчуваецца актыўная аўтарская маральная пазіцыя, унутраная дыялогавасць, душа твора, які дае разуменне пра гарызонт чакання як сістэму ўяўленняў, што вызначаюць адносіны паэта да грамадства, і пэўным чынам фарміруе наш светапогляд.

Яшчэ адна асаблівасць светапогляду Анатоля Вярцінскага – яго гуманізм. Да якой з'явы ні дакранулася б свядомасць мастака, яна выпраменьвае іскрынкі дабрыні і чалавечнасці. Кожная дэталь знешняга свету, кожны зрух у душы лірычнага героя «нанізваюцца» на стрыжань чалавекалюбства, веры, упэўненасці, што зло – не вечнае, хоць за ім – чорныя, магутныя сілы. Паэт верыць у перамогу дабра: перамагае фашыстаў хлопец з Арла, які спыніў танкавую калону немцаў пад Крычавам і быў пахаваны ворагамі ганарова, як герой («Бой»), перамагае Леў Талстой артадоксаў ад рэлігіі і нясе людзям сваю ачышчаную ад кан'юнктуры праўду («Адлучэнне Талстога ад царквы»), перамагае «святло зямное», а не цемра. Дарэчы, паэт менавіта гэтымі двума шматзначнымі словамі назваў свой зборнік выбранай паэзіі. Верш А. Вярцінскага «Просьба» – не толькі крэда паэта, якому хочацца бачыць усіх людзей людзьмі, «чалавекамі», але і яркі ўзор стылю, дзе няма нічога лішняга, поўнасцю адсутнічаюць экзатычныя тропы, разгортваецца ўнутраная дыялогавая дыскусія на тэму «Быць чалавекам», паўстае над усім думка, а высокі адычны настрой ствараецца сістэмай паўтораў, перастаноўкай слоў, клічнай інтанацыяй, звароткамі і іншымі сродкамі паэтычнага сінтаксісу:

Не прашу я доўгага веку,
Не прашу асаблівай любві.
Я прашу цябе: «Будзь чалавекам!»
Я прашу вас: «Будзьце людзьмі!»
Нельга ж вечна жыць, як некалі.
Час другі зусім – глядзі.
Людзі! Будзьце чалавекаміі
Чалавекі! Будзьце людзьмі!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Звернем увагу на тое, што ў творчасці А.Вярцінскага з філасафічнасцю арганічна знітаваная тэзіснасць, стройнасць і строгасць пабудовы большасці вершаў паэта, наяўнасць у іх апошніх радкоў – высноваў, кандэнсатаў маралі – вось «фармальная» рэалізацыя доказнасці як стылявой дамінанты паэтавай творчасці. У сувязі з вышэй адзначаным, ствараецца ўражанне, што мастак – не паэт з філолагаў, душы якіх былі адкрытыя наросхрыст вятрам «эпохі Надзей», а пачуцці так і білі крыніцай, а хутчэй з «тэхналагічнага», навукова-інтэлектуальнага асяроддзя: усё ў яго творчасці такое лагічнае, упарадкаванае роздумнасцю, удумліва пабудаванае.

**Пытанні і заданні:**

1. Законспектуйце асноўныя этапы жыцця і творчасці А.Вярцінскага.
2. Самастойна прачытайце аўтабіяграфію Анатоля Вярцінскага.
3. Якія вершы паэта вы вывучалі ў папярэдніх класах?
4. Ахарактарызуйце асноўныя этапы творчасці Анатоля Вярцінскага.
5. Вызначце тэматыку лірыкі А.Вярцінскага.
6. Пацвердзіце канкрэтным аналізам, што паэт арыентаваўся на ацэнку, аналіз рэчаіснасці.
7. Чаму паэзію А. Вярцінскага можна назваць лірыкай рацыяналістычнай развагі?
8. Ці праявіўся ў творах Вярцінскага публіцыстычны пачатак? Чым гэта тлумачыцца?
9. Якія маральна-этычныя і філасофскія праблемы закранае паэт у сваіх творах?
10. Прааналізуйце верш А.Вярцінскага «Заканамернасць» («Як бы ні слаўна паход пачаўся…»). Якімі паэтычнымі сродкамі карыстаецца ў ім паэт?
11. Параўнайце індывідуальныя стылі А.Вярцінскага і Р. Барадуліна.
12. Да наступных заняткаў прачытайце паэму Анатоля Вярцінскага «Песня пра хлеб».

**Другі ўрок: Жанравая разнастайнасць лірыкі А. Вярцінскага. Паэма “Песня пра хлеб”.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адным з самых распаўсюджаных жанраў у творчасці Анатоля Вярцінскага з'яўляецца **прытча** – жанр старажытны, эталагічны, павучальны. Мае свае вытокі яшчэ ў Бібліі. Грунтуецца на мастацкіх прынцыпах іншасказальнасці, упадабнення, перанясення прыкметаў з адных з'яваў і прадметаў на другія і значнага абагульнення. Усе вызначальныя адзнакі прытчы ідуць здаўна, са старажытнасці, былі ўласцівыя творчасці і Гамера, і Эзопа, і Сумарокава, і многіх іншых мастакоў свету. Гэты жанр блізкі прыёмамі пісьма да байкі, казкі, метафары – тых твораў, у якіх не апошняе месца займаюць мараль, дыдактычная выснова, сэнсавая падтэкставасць. Прытча не падобная на апісальныя, выяўленчыя жанры.

І адбылося так, што ў творчасці Вярцінскага пераважыў інтэлектуальны пачатак над пачуццёвым, а апасродкаваная рэакцыя на жыццёвы вопыт чалавецтва павялічыла выхавальныя магчымасці яго лірыкі. Дарэчы, аўтарскае вызначэнне прыналежнасці да жанру прытчы атрымалі толькі тры ягоныя твор – «Дурман», «Арол галодны і сыты», «Мы, мёд і пчала». Астатнія ж вершы даследчыкі лічаць прытчамі па фармальна-змястоўных прыкметах. Яшчэ ў першых вершах паэт пачаў распавядаць прытчу пра блуднага сына – усё чалавецтва. Вытокі падобнай прытчавасці знаходзяцца ў міфе, міфа-паэтычным мысленні, непасрэдна звязаным з травесціяй пры адным выключэнні: у А. Вярцінскага страчана «першабытная» паэтычная фігуральнасць і мастацка-метафарычная вобразнасць, аднак эмацыянальнасць набывае дынамічнае ўвасабленне іншымі – рытміка-інтанацыйнымі – сродкамі.

У прытчах («Косім траву – яна не крычыць...», «Ноччу заплакала дзіця», «Вы зразумейце правільна...» і інш.) паэт працягнуў традыцыі К. Тураўскага, З. Бядулі, Ядвігіна Ш., Якуба Коласа, выйшаў на максімальнае абагульненне, звярнуўся не толькі да індывідуальнага чытача, але і да чытача грамадскага, агульнага, масавага, таму яны – іншарэальнасць, што з'яўляецца універсумам. Стаўшы адной з дамінантных стылявых рыс, прытчавасць мастака, у адрозненне ад сіпакоўскай з элементамі апісання, расквечанымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тропамі, афармляецца не толькі ў прытчы-маналогі, але і найперш у вершы-разважанні з элементамі дыялогу. Бывае, што дыялогавы пачатак выходзіць на першы план, канчаткова выцясняе аўтарскія медытацыі, як у «Адлучэнні Талстога ад царквы», а бывае, уваходзіць у твор асобнымі астраўкамі («Каментарый да Карана»). Такім спосабам падачы матэрыялу характарызуюцца вершы з элементамі прытчавасці, заснаваныя на непасрэдным звароце да ўяўнага чытача-рэцыпіента («Парада юным закаханым», «Няма дурных» і інш.). Маштабная задума – абагуліць вопыт паводзінаў чалавецтва на працягу многіх стагоддзяў – рэалізуецца ў таленавітага майстра слова ў змешаных жанравых ліра-эпічных і ліра-эпіка-драматургічных прытчах і прытчаформах.

Арыентацыя на ўнутраны маналог, на зварот не толькі да чытача, але і да універсума-чалавецтва знаходзіць увасабленне ў яшчэ адной даволі распаўсюджанай жанравай форме ў А. Вярцінскага – у **вершах-зваротах**, закліках з абавязковымі элементамі павучальнасці («Медсястры», «Пасмяротна рэабілітаваным», «Просьба», «Некалькі пытанняў да лесу», «Перасцярога» і інш.). Так, верш «Просьба», напісаны ў форме непасрэднага звароту да чалавецтва, сведчыць пра імкненне паэта да ўзвышэння чалавечай асобы і занатавання сувязі часоў і пакаленняў.

«А я маўчаў, як ідыёт», – так пачынаецца гумарыстычны, сатырычны, трохі сентыментальны верш-прытча «Анекдоты, ці Малітва ў гасцях», – споведзь разгубленага на людзях, нясмелага чалавека, якому прырода не падаравала таленту быць клоунам, у якога «слаба падвешаны язык». Чалавек падсвядома цягнецца да застольшчыкаў, сярод якіх і жанчына, якая яму падабаецца, аднак у той жа час яго натура супрацьстаіць станоўчаму ўражанню пра прысутных і пра ўласную няўклюднасць і нязграбнасць; унутраны голас падказвае яму, што ягоная нязграбнасць за сталом – яго ратунак, яго чалавечы знак. У вершы перадаецца складаная ўнутраная барацьба ў свядомасці чалавека, які хоча застацца шчырым і добрым, самім сабой у чужым асяроддзі. Верш драматургічны. Па сутнасці, гэта драма

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

душы, якая разыгрываецца перад чытачом з першага і да апошняга радка. Твор напісаны са светлай, ненатужнай гумарынкай, як і многія паэтавы рэчы, яго вылучае размоўнасць інтанацыі, стылявая (калі мець на ўвазе слоўнае афармленне) празрыстасць, лаканізм:

Сяджу і маўчу вось, як нямы.
Божа, я ведаю, родны божа,
што анекдоты расказваць пошла, –
не для таго збіраемся мы.
І ведаю я, што гэты тост
не толькі пошлы, але і няшчыры,
няварты госця і мужчыны,
што аўтар тоста – шалахвост.
І знаю: фальшываць гаспадары,
калі ўсе хваляць патрэбнага госця…
І ўсё-такі дай мне які досціп,
дай анекдот, хаця б стары.

Псіхалагічная напружанасць баталіі з «інтэлігентным» застоллем заканчваецца трагедыйна: адзіным выйсцем з падобнага становішча для героя аказваецца маўчанне. Верш праўдзіва адлюстроўвае стан грамадства застойнага перыяду, калі ваяўнічасць прыстасаванцаў дасягнула велізарных памераў, а пратэст людзей-дзівакоў, рамантыкаў згасаў пад націскам абыякавасці і раўнадушша. Так звычайная бытавая замалёўка разрастаецца ў крык змучанай і спакутаванай душы – «Людзі, ратуйце нашы душы».

Жанр **оды** таксама атрымаў належнае распаўсюджанне ў творчасці Вярцінскага. Адычнасць гучання ўласціва многім вершам паэта пра вайну і пра рух часу, і пра Чалавека як Асобу. Паэтаў гуманізм як асаблівасць светапогляду прывёў да заканамернага ўзнікнення ў лірыцы одаў чалавеку, які ў пагранічных сітуацыях застаецца перш за ўсё асобай, чулай да болю і перажыванняў іншых, нясе і не губляе свой «чалавечы знак», праходзіць выпрабаванне часам на дабрыню («Ода добрым людзям», «Мы напачатку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зазналі страху», «Навагодні тост», «Дзівак-чалавек», «Ода магчымасцям мірнага жыцця, або Штрых да партрэта Васіля Быкава»). Дарэчы, адычнае гучанне ўласціва не толькі адзначаным вершам-павучэнням, але і многім іншым творам.

Як мы ўжо адзначалі, паэт больш чуйны да чужога болю і гора, чым да радасці, таму медытатыўная **элегія** займае не апошняе месца ў вобразным свеце А. Вярцінскага. Аднак нельга гаварыць пра элегічнасць як асноўны прынцып у творчасці гэтага мастака ў адрозненне ад Янкі Сіпакова.

Яшчэ да пачатку XX стагоддзя склаліся тры асноўныя разнавіднасці элегіі: эталагічная, або публіцыстычна-заклікавая, медытатыўна-філасофская і апісальна-выяўленчая. Яны часта ўзаемадзейнічаюць і дапаўняюць адна адну, але элегічны пафас у іх застаецца аднолькавым – пафас суму, расчаравання, незадаволенасці, шкадавання і адпаведны яму глыбокі псіхалагізм як вынік імкнення аўтараў паказаць змены, зрухі, эвалюцыю ўнутраных перажыванняў, незадаволенасць жыццём. Элегіі Вярцінскага – пацверджанне нашага зыходнага тэзісу пра **павучальнасць** як дамінанту яго стылю. Напрыклад, эталагічная элегія «Баіцца быць беларус беларусам...» прасякнута не толькі горыччу, выкліканай разуменнем неадпаведнасці магчымасцей і духоўнага патэнцыялу беларусаў і іх нізкай самаацэнкі, але і ўтрымлівае моцны эталагічны пафас, заклікае людзей задумацца над складаным пытаннем пра самарэалізацыю нацыі, прычым адказ на яго застаецца адкрытым: «Не знае, рабіць што з апошнім шанцам, // які ён сёння атрымоўвае, // як быць з сваім імем, з сваёю моваю, // быць ці не быць беларусам нарэшце...».

Часцей за ўсё элегіі А. Вярцінскага прасякнутыя думкамі пра чалавека і чалавецтва, рух і зменлівасць часу, пра страту кахання, пра непазбежную смерць, пра прадаўжэнне жыцця ў нашчадках («З жалем гляджу на дзіця...», «Хлопчык глядзіць», «Мы жывём, каб вяртацца...», «Трагічна-сумная няўвязка...»).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Жанр **балады** таксама не атрымаў шырокага распаўсюджання ў паэзіі Анатоля Вярцінскага, як у творчасці іншых прадстаўнікоў «філалагічнага пакалення», у прыватнасці, Янкі Сіпакова. Гэта тлумачыцца перш за ўсё тым, што «рамантычны светапогляд» не быў уласцівы Вярцінскаму ў такой моцнай ступені, як іншым паэтам-шасцідзесятнікам, ён – паэт-публіцыст, аратар-»навучыцель». Хоць многія творы яго заснаваныя на паказе супрацьстаяння Дабра і Зла, паэт не імкнецца з найбольшай дакладнасцю апісаць гэты канфлікт, а галоўная яго задача – паказаць вынік гэтай барацьбы, выказаць свае парады і разуменне яе прычын і тым самым навучыць людзей супрацьстаяць Злу ў яго універсальна-касмічным абліччы. Толькі адзін твор мае ўласна-аўтарскае вызначэнне балады («Балада пра спаленую вёску і жывога пеўня»), астатнія – гэта вершы баладнага характару («Ратунак», песні з п’есы-казкі «Скажы мне сваё імя, салдат»), якіх вельмі мала.

**Вершаў-прысвячэнняў** у паэта значна больш, чым балад: «Скажы мне, мама...» (памяці І. Хадановіча), «Пра дзярзанне» (памяці М.Ц. Лынькова), «Сустрэча на Паркавай магістралі» (студэнтцы БДУ, паэтэсе Яўгеніі Янішчыц), таксама паэма «Заазер’е» прысвечана памяці маці. Паэт балюча перажывае адсутнасць адрасатаў вершаў, без якіх шмат што страціў і сам і наша грамадства, якое часта не цэніць таленты, і жывуць яны толькі ў памяці сумленных суграмадзян і ў сваіх творах. На гэтай глебе з’явіліся ў Вярцінскага вершы-эпітафіі, якія працягваюць традыцыі гэтага жанру ў беларускай літаратуры, маюць моцную сувязь з фальклорам, з абрадавымі песнямі. Сваёй паэзіяй Анатоль Вярцінскі не толькі паспяхова асвоіў сталыя жанры і жанравыя формы, але і надаў ім новы **эталагічны** змест, стварыў новы жанр «проза-паэзіі» (вершы-зонгі з лібрэта оперы па матывах аповесці В. Быкава «Воўчая зграя»).

Вершы-роздумы, медытацыі, разважанні і вершы-заклікі, прамовы, павучанні, прытчы, рэпартажы знаходзяцца ў паэзіі Вярцінскага ў адной повязі. Паэту надзвычай дарагі палітычны факт, дакумент, з якога ён

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выкрасае іскрынкі сапраўднай эмацыянальнасці. Асабліва выразна «палітычная дасведчанасць» і прыхільнасць да скарыстання дакументальнага пачатку раскрываюцца ў замежных рэпартажах са зборніка паэта «Ветрана». Як і Панчанка (верш «Паэзія»), Вярцінскі не адмяжоўвае публіцыстычнае ад мастацкага, а непрыкметна для чытача яднае іх шчырай асабістай зацікаўленасцю, усхваляванасцю, адкрытасцю, даверлівасцю да рэцыпіента. Лозунг, палітычны тэзіс, выказаныя паэтам-прамоўцам і трыбунам, заўсёды пацверджаныя, сагрэтыя клопатам пра дабро. Уся лірыка паэта становіцца як бы суцэльнай прытчай пра Дабро і Зло, Праўду і Ману, праметэяў і непраметэяў. Прытча гэтая з пачаткам і канцом, «апошнімі сігналамі», мае грунтам шматвяковы вопыт чалавецтва, носіць адкрыта павучальны характар. Прычым павучальнасць у Вярцінскага надзвычай рэфлектыўная, што выклікае «вязкасць» пісьма, вяртанне да зыходных тэзісаў пра чалавечнасць і бесчалавечнасць, паўтарэнні, што нанізваюцца адно на адно і ў асобных вершах, і ў паэзіі ў цэлым, канструкцыі фраз, прыдатных для адстойвання і пацверджанння пэўнага тэзісу.

Аналіз **паэмы "Песня пра хлеб"** можна правесці ра наступных пытаннях:

1. Агульная характарыстыка гістарычных абставін, у якіх быў напісаны твор.

2. Месца твора ў сістэме літаратурнай дзейнасці пісьменніка:

– да якога перыяду ён адносіцца;

–ці працаваў аўтар у час напісання твора над іншымі творамі.

3. Звесткі аб першай публікацыі твора, аб уплыве на свядомасць чытача, аб крытычных ацэнках твора (звяртаецца ўвага і на новае прачытанне).

4. Характарыстыка:

— тэматыкі, праблематыкі;

— асаблівасцей сюжэта, кампазіцыі, стылю твора;

— мастацкіх сродкаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— ідэйнага зместу твора.

5. Аналіз філасофскай канцэпцыі аўтара.

6. Вашы асабістыя адносіны да мастацкага твора.

7. Прывядзіце прыклады ўрыўкаў твора, у якіх ёсць пацверджанні вашым разважанням аб асблівасцях кампазіцыі, стылю, аб філасофскай канцэпцыі аўтара.

**Пытанні і заданні:**

1. Жанр прытчы ў творчасці Анатоля Вярцінскага. Чаму яна стала жанравай прыкметай індывідуальнага стылю мастака?
2. Прааналізуйце прытчу А.Вярцінскага «Косім траву – яна не крычыць...».
3. Якія вершы адычнага гучання А.Вярцінскага вы ведаеце?
4. Ці адрозніваюцца оды паэта ад твораў падобнага жанру ў творчасці Я.Сіпакова?
5. Што такое вершы-звароты і вершы-прысвячэнні. Чым яны адрозніваюцца? Прааналізуйце твор паэта «Медсястры».
6. Чаму ў лірыцы А.Вярцінскага амаль не праявіўся элегічны пачатак? Якія элегіі паэта вы ведаеце?
7. Па якой прычыне жанр балады не атрымаў шырокага распаўсюджання ў паэзіі Анатоля Вярцінскага. Прааналізуйце твор паэта «Балада пра спаленую вёску і жывога пеўня».
8. Ахарактарызуйце ў цэлым жанравую палітру творчасці мастака.
9. Чаму мы з поўным правам можам гаварыць пра перавагу ў вобразным свеце А. Вярцінскага абстрактна-філасофскага пачатку?

## ЯНКА СІПАКОЎ (нар. у 1936 г.)

**Мэта ўрокаў: спрыяць** знаёмству вучняў з кароткімі звесткамі пра жыццё і творчасць паэта; вызначыць асноўныя рысы паэзіі Янкі Сіпакова, паказаць, што вобразны свет пісьменніка ўяўляе сабой цэласную сістэму; праз мастацкі аналіз даследаваць асноўную праблему вершаў паэта; развіваць уменні аналізу мастацкага твора як мастацкага цэлага; праз аналіз твораў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паўплываць на фарміраванне ўнутранага свету вучняў, іх эмацыянальнага вопыту.

**Першы ўрок: Старонкі біяграфіі і творчасці пісьменніка. Тэматычны дыяпазон лірыкі паэта.**

**Паапярэдняе дамашняе заданне:** Падрыхтаваць рэферат, прысвечаны жыццёваму і творчаму шляху Янкі Сіпакова.

Дадатковым матэрыялам да ўрока можа служыць аўтабіяграфія Янкі Сіпакова.

«Калі ў дзяцінстве гаварылі, што мяне прынёс бусел, я ніяк не мог даўмецца, як гэта здарылася: нарадзіўся я ў самай сярэдзіне зімы. 15 студзеня 1936 года, калі на нашай Аршаншчыне не было не толькі ніякіх буслоў, але нават снегіры і тыя, натапырыўшыся, грэліся каля акон комінаў. І ўсё ж я ўяўляў, як стомлены і абмарожаны бусел, разявіўшы ад прыемнай цеплыні дзюбу, грэе на нашай печы свае чырвоныя ногі, а радасныя маці і бацька кормяць яго духмянымі праснакамі.

Маці мая, Вулляна Пракопаўна, працавала даяркаю ў калгасе, а бацька, Даніла Іванавіч,– начным вартаўніком на ферме. Да мяне ўжо бусел прыаёс ім трох дачушак.

Бацька быў вялікі фаятазёр. Кожную раніцу ён выдумляў мне, як на ферму, захмялелыя ад пiліпаўскіх вяселляў, прыходзілі ваўкі, як ён ратаваў ад іх калгасную жывёлу – і пры гэтым ніколі не паўтараўся. Яму памагалі іншыя мужчыны, якіх у нашай хаце заўсёды было поўна. А яшчэ больш было дыму: навальнічнымі воблакамі клубіўся ён нават ля самай падлогі. Маці часта прасіла: «Меней вы курыце. Ужо і так хоць тапор вешай». Вось гэты дым упершыню і сутыкнуў мяне сам-насам з вобразным мысленнем. Я, паверыўшы, што дым, які можа трымаць тапор, утрымае і мяне, рынуўся з лаўкі на тытунёвыя воблакі з надзеяй палятаць. Пасля гэтага выпадку мне, мусіць, трэба было трымацца як мага далей ад вобразнага мыслення, а я, наадварот, узяў яго за мэту свайго жыцця, таму, здараецца, атрымліваю ладныя кухталі ад рэцэнзентаў...

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На фашыстаў, на вайну спачатку была ў мяне свая балючая крыўда. Якраз перад гэтым бацька дазволіў мне па-мужчынску сядзець на калёсах – прасунуўшы ногі праз драбіны. А заўтра ён збіраўся ехаць па сена і абяцаў, калі павядзём паіць каня, навучыць мяне сядзець верхам на адным баку.

Але заўтра – гэта было ўжо 22 чэрвеня...

І вось бацька гоніць калгасных кароў на ўсход – ратаваць ад фашыстаў.

Праз нашы Зубрэвічы адыходзяць апошнія чырвонаармейцы. Адзін з іх (памятаю, чалавек у гадах ужо) бярэ мяне на рукі, моцна прыціскае да сябе – аж мне муляе скатка яго шынялю – і гаворыць: «Ну, трымайся, мужчына!» А сам плача... У вёску прыязджаюць першыя немцы. Машынамі, на якіх, дзе можна, прычэплены клеткі з курамі. Немцы іграюць на гармоніках, на гуслях. Яны зганяюць зубраўцоў на рынак. Дзецям сыплюць жмені цукерак. Вядома, нарабаваных у нашых савецкіх крамах.

Вяртаецца бацька – зарослы, незнаёмы, злы: механізаваныя нямецкія часці ішлі, вядома, хутчэй, чым каровы. Немцы прыйшлі ў Смаленск раней, чым бацька са сваім гуртам.

Мой дваюрадны брат Мікалай Кантроўскі ідзе ў лес. З гэтага часу ў нас часта бываюць партызаны. Яны начуюць у нашай хаце пасля заданняў, хаваюцца на гарышчы ў час блакад. Бывала, ноччу я ніяк не мог дайсці да дзвярэй: чапляўся за кулямёты, за ногі партызан, якія ўпокат спалі на падлозе. Не адзін раз начаваў у нас і Аляксей Кантроўскі з Зарэчча, па вясковай мянушцы «Блот», які потым здрадзіў Радзіме і з партызан падаўся ў паслугачы гестапа. Маці і бацька ведалі, што гэта значыць.

І сапраўды, вясною, калі мы, хлапчукі, сядзелі на бярвенні і рабілі з вербавых пруткоў свістуны, у канцы вёскі паказаліся паліцаі. Мы кінуліся за імі – паглядзець, да каго яны ідуць. Паліцаі завярнулі ў наш двор...

Калі я ўбег у хату, усё было перавернута дагары нагамі – паліцаі нечага шукалі. Бацька сядзеў на лаўцы – стомлены і нейкі супакоены. Яшчэ і сёння я памятаю яго пагляд, якім ён абводзіў нашу хату: здавалася, ён ласкава гладзіць ім кожную дробязь у хаце – і крук, на якім вісела калыска ўсіх яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чатырох дзяцей, і стол, зроблены ім самім, і клямку, за якую вось зараз трэба брацца...

Бацька дамоў не вярнуўся. Яго закатавалі ў Оршы, у гестапа. Уведаўшы, што ён вельмі ўражлівы і не выносіць людскіх пакут, фашысты даймалі яго сваімі забавамі: яа допыце перад ім заўсёды кідалі нейкую новую змардаваную ахвяру – кавалак жывога мяса, у якім ужо ледзь угадваўся чалавек.

Так забаўляліся тыя ж немцы, якія спачатку частавалі нас, дзяцей, цукеркамі...

Праз колькі часу забралі і маці. Паліцаі прыехалі раніцою, калі яна збіралася ў поле – час ужо быў сеяць. Маці доўга развітвалася з намі і ніяк не магла адпусціць ад сябе. Я ж не разумеў, чаго яна і ўсе жанчыны, што праводзілі яе, гэтак плачуць: усе ж гавораць, што маці забіраюць толькі дні на два. І якімі доўгімі здаліся мне тыя два дні, а потым і цэлыя гады чакання, калі ўсё верыў – заўтра вернецца маці. Але маці не вярнулася...»[1].

Першыя літаратурныя вопыты Я. Сіпакова адносяцца да школьных гадоў. Але пачаткам свайго творчага шляху паэт лічыць наступнае: «Выразна памятаю дзень, звычайны дзень... які выключна нічым не адрозніваўся ад іншых. Ён быў шэры, адліжны, ветраны, хаты нейкія мокрыя, як пакрыўджаныя дымам, над вёскай віселі злямчаныя воблакі, недалёкі лес быў як у тумане... Словам, дзень быў цьмяны, нават нудны... А для мяне ён быў нейкі незвычайны. Мяне штосьці непакоіла, я быў усхваляваны, узбуджаны і нават узрадаваны – той стан быў вельмі падобны на экстаз. Мне хацелася як найлепш напісаць пра гэты дзень, запісаць яго якраз такім, які ён быў на самай справе. Я ўжо не памятаю, пра што я пісаў у тым сваім вершы, памятаю толькі, што ў мяне нічога не выходзіла (дзень атрымаўся зусім іншы), і мне хацелася плакаць. І я, не саромячыся сябе, плакаў. А вытокі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

---

[1] Сіпакоў Я. Замаразкі на першацвет // Вытокі песні. Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мн., 1973. – С. 262 – 270.

мусіць, усялякай творчасці ў душы. У душы, якая не можа быць абыякавай, усё суперажывае, адгукваецца і на чужы боль, і на чужую радасць»[2].

У Я.Сіпакова паступова выпрацоўваецца ўзаемазвязаная і ўзаемаабумоўленая градацыя паняццяў «думка» – «слова» – «вобраз», пры вызначальнай ролі першага. Але толькі слова – выява глыбокай думкі – можа стаць яркім мастацкім вобразам і разам з тым адзнакай таленавітасці, арыгінальнасці творцы. У гэтай кнізе Янка Сіпакоў дасягнуў вышэйшага майстэрства валодання словам, калі думка, пачуццё і слова становяцца адным і тым жа, калі аўтар ужо звяртаецца да такой складанай жанравай формы, як санет, калі лірычны герой амаль тоесны аўтару, калі паэт насычае свае творы не толькі разнастайнымі «рэчыўнымі» вобразамі і яскравымі выяўленчымі сродкамі, але і такімі шматзначнымі вобразамі-сімваламі, як Дабрыня, Час, калі па-язычніцку смела і ярка паядноўвае чалавечы пачатак з прыродным. Любоў да прыроды перарастае ў яго творах у сапраўдную сакралізацыю яе як усеагульнай першакрыніцы жыцця, прыгажосці. Таму адухаўленне неадухоўленага (рэчаў, з'яў прыроды), антрапамарфізм жывых істот становяцца асновай галоўнага выяўленчага прыёму ў лірыцы паэта («Лес прачынаецца», «Хмара», «Сонца села», «Заходзіць яблык», «Кроплі сонца», «Пушчу турбуе клопат адзін»):

Ах, як весяліцца гай пад сугрэвам,
Ах, як смяецца вясною лес!
Бы пад карыцу вясновым дрэвам
Смяюн-смяюнчык шчыкотны ўлез...

Нават ужо першыя зборнікі паэта сведчаць аб яго вернасці метафарычнаму, вобразнаму, а значыцца – найбольш архаічнаму светаўяўленню. Свежасць паэтычнага бачання, схільнасць да яркай метафарычнасці, да канкрэтнага ўспрымання, востры зрок і слых, пульсуючы, эмацыянальны радок – усё гэта вартасці паэзіі Янкі Сіпакова, вызначаныя спецыфікай яго вобразнага мыслення. Адсюль і яе, можа, значна

---

[2] Цытуецца па кнізе: Лысенка А.Ф. Лінія гарызонта: Нарыс творчасці Я.Сіпакова. – Мн.,1986. – С.9.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

большая, чым у «рацыяналіста» А. Вярцінскага, сувязь з прыродай, навакольным асяроддзем, «зямная першароднасць», калі так можна сказаць, бо Янка Сіпакоў імкнецца паказаць унутраны стан чалавека, які ўсімі карэннямі звязаны з роднай зямлёй, з народам, усім ачалавечаным светам. І разам з тым яго лірычны герой здольны дасягнуць такіх духоўных вышынь, якія даступныя толькі ўсяму чалавецтву.

Паэзія Сіпакова каштоўная не толькі тым, што ў ёй раскрываюцца пачуцці, перажыванні тонкай асобы, яе незвычайная ўлюбёнасць у свет. Тое ж самае не ў меншай ступені ўласціва ўсім сапраўдным пісьменнікам. Аднак творы Сіпакова ўражваюць чымсьці непаўторна зямным, ціхім і пяшчотным, родным і шматзначным. Яны як бы непасрэдна «вынікаюць» з прыродных назіранняў, каб затым зноў увасобіцца ў слоўную вопратку.

Так лірычны герой у паэзіі Янкі Сіпакова – часцей за ўсё асоба неўтаймаваная, ранімая, з абвостраным рэагаваннем на няпраўду і зло жыцця, чые ідэалы надзвычай высокія, што абумоўлена вайной, сіроцтвам. Янка Сіпакоў не ў меншай ступені, чым Рыгор Барадулін, зямны мастак.

**Пытанні і заданні:**

1. Ці знаёміліся вы з творамі Янкі Сіпакова ў папярэдніх класах?

2. У чым заключаецца трагізм лёсу Я.Сіпакова? Якімі фактарамі ён быў абумоўлены?

3. Самастойна пазнаёмцеся з аўтабіяграфіяй Янкі Сіпакова. Як ацэньвае паэт свой лёс і лёс пакалення шасцідзесятнікаў у цэлым?

4. Растлумачце сімвалічны сэнс назваў зборнікаў Янкі Сіпакова «Сонечны дождж», «Лірычны вырай», «Веча славянскіх балад», «У поўдзень, да вады»?

5. Якія праблемы закранае ў сваёй лірыцы Янка Сіпакоў? Адказ падмацуйце прыкладамі з прачытаных твораў.

6. У чым заключаецца асаблівасць першага зборніка Янкі Сіпакова «Сонечны дождж»? Цэласна прааналізуйце верш «Адгукніся...», вызначце лірычны і эпічны пачаткі ў ім.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

7. Якія вершы з кнігі Я. Сіпакова «Дзень» сведчаць пра пераход мастака ад назіральнасці за рэчаіснасцю да глыбокага асэнсавання яе праяў?

8. Вызначце скразную ідэю зборніка Янкі Сіпакова «Веча славянскіх балад». Паразважайце над часавым і прасторавым вымярэннем кнігі балад Янкі Сіпакова.

9. У чым заключаецца роля кнігі «Веча славянскіх балад» у нацыянальнай літаратуры?

10. Вызначце тэматыку і праблематыку зборніка паэта «У поўдзень, да вады». Якаму паэтычнаму жанру аддаецца перавага ў ім?

11. Ці адрозніваюцца праблемы, якія закранае ў сваёй лірыцы Я.Сіпакоў ад праблем, што адпаведна адлюстроўвалі В.Зуёнак і Р.Барадулін?

**Другі ўрок: Жанравае багацце лірыкі Янкі Сіпакова. паэма «Одзіум»**

Найбольш пашыранымі традыцыйнымі жанрамі і жанравымі формамі ў паэзіі Янкі Сіпакова з’яўляюцца балада, ода, элегія, санет. Але трагедыйнасць чалавечага жыцця, бездапаможнасць асобы перад магутным рухавіком гісторыі выводзяць на першую пазіцыю баладу і элегію, прасякнутыя роздумамі аб прычынах падобнай сітуацыі, шляхах яе пераадолення, аб вечных праблемах чалавечага існавання. На другую ж пазіцыю адыходзіць ода як жанр апалагетычны, неадпаведны часу, настрою, пафасу XX стагоддзя ў цэлым.

Найбольш выразна «сінтэтызм» лірычнай паэзіі Янкі Сіпакова выяўляецца якраз у **элегіях**, якія адрозніваюцца ад элегій малавопытных аўтараў шматварыянтнасцю, маштабнасцю зместу, пры поўным захаванні смутку, самоты і жалю, як адметных прыкмет яе традыцыйнай змястоўнасці.

У аснове ўсіх элегій паэта ляжыць пачуццё даверу, якое дапамагае лірычнаму герою прайсці праз усе выпрабаванні і боль («Здараецца, наплыне дабрыня…», «У траве пажухлай і счарнелай…»). Але тая ж самая даверлівасць прымушае лірычнага героя шмат пакутаваць і востра адчуваць крыўду («Адзін другога крыўдзім порадзь…», «Ты кінуў слова ў мяне…»),

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пасля чаго душа яго зноў прагне ачышчэння, чарговага катарсісу. Абавязковая рыса элегій Сіпакова – дэкларацыя свабоды асобы як вызначальнай умовы сапраўднага чалавечага жыцця. «Элегізм» мастака слова не дапускае аднастайнай сумнай танальнасці, псіхалагічнай статычнасці, пачуццёвай расслабленасці, таму ў яго вершах паралельна з самотай вельмі часта прысутнічае ўсмешка. Інакш кажучы, сум выклікае жаданне адчуць радасць, выклікае рух да авалодання ёю. Нездарма ў паэта ёсць верш «І прыйдзе смутак нечакана…», які можна назваць элегіяй «**суму як прадвесніка радасці**»: «Таму і смутак нам патрэбен, // Каб радасць большаю была».

Янка Сіпакоў – мастак, які пастаянна ўдасканальвае свой стыль, паэтыку, таму ў яго творчасці заўсёды адбываюцца змены – рух ад простага да складанага. Так, нават ужо ў межах аднаго жанру – элегіі – відавочная паступовая стылявая эвалюцыя аўтара – ад апісальнасці, выяўленчасці да заглыблення ў сферу свядомага, напружанага асэнсавання рэчаіснасці з мэтай выяўлення яе істотных заканамернасцей, да самапаглыблення, медытатыўнасці. **Медытатыўная элегія** – гэта элегія актыўнай думкі, высокага аналітызму, напружанага, але разумна арганізаванага, гарманічнага перажывання. Янка Сіпакоў паўстае ў такога роду творах філосафам, які глыбока пазнае сябе і свет, вырашае складаныя праблемы чалавечага існавання, гісторыі, жыцця. У такой разнавіднасці элегій паэт знайшоў новы варыянт паэзіі думкі, лагічных канструкцый, напоўніў іх не толькі сумам, але і роздумам. Мастак у падобных вершах працягвае традыцыі медытатыўнай элегіі, цэнтральны нерв якой складаюць пакуты і перажыванні сумленнага чалавека, які бачыць, як драбнеюць людзі, іх пачуцці, як паддаюцца яны спакусе лёгкага і бязбеднага жыцця, апранаюць маскі задаволенасці, сытасці і спакою: «Мы весялімся, нібы дзеці… // А болю – цесна болю: у свеце // Перанаселенасць на боль». Гэта медытатыўная элегія «**болю**», у якой паэт разважае пра сучасны стан чалавецтва, пра яго здрабненне і жорсткасць, адсутнасць у многіх людскіх сэрцах міласэрнасці. І толькі паэту не ўсё роўна,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

а таму ён перажывае, спачувае нават гэтай раўнадушнай частцы чалавецтва: «Дзе нам баліць, там і душа: // З душы ўвесь чалавек сабраны. // Мы адкрываем нечакана – // Дзе нам баліць, там і душа».

**Балада** – вельмі старажытны жанр. Адным з самых яркіх прадстаўнікоў баладнага жанру з’яўляецца паэт пасляваеннага пакалення Янка Сіпакоў, зборнік якога «Веча славянскіх балад» па праву займае значнае месца ў гісторыі беларускай літаратуры. Балада сінтэзуе ў сабе лірычны, эпічны і драматургічны пачаткі. Аўтара балады цікавіць эпічнае здарэнне, але не само па сабе, а менавіта тым, што яно дае магчымасць паказаць веліч ці нізкасць чалавечага духу, выказаць свае адносіны да пэўнай з’явы. Драматычнасць жа балады абумоўлена складанасцю канфлікту паміж Дабром і Злом, імкненнямі чалавека да нечага светлага і немагчымасцю іх здзяйснення. Баладзе ўласцівыя гераічны пафас, што вынікае з трагедыйнай калізіі і трагедыйнага сюжэта, а таксама дынамізм, ад якога дзеянне «выходзіць напаверх», не губляецца, пераплятаецца з пачуццём, узбагачае і «актывізуе» яго.

Балада выступае ў чатырох галоўных разнавіднасцях: як чыста эпічная, калі ў яе аснову пакладзены падзеі, дзеянне; пераважна лірычная, у якой аўтар праз апісанне пачуццяў і перажыванняў лірычнага героя выяўляе свае адносіны да свету; выразна драматургічная, заснаваная на канфлікце і напружаным дзеянні; і сінтэтычная, якая з’яўляецца вынікам сінтэзу адзнак трох вышэйназваных разнавіднасцей.

У жанравых адносінах балады разнастайныя. Гэта балады-паданні, балады-легенды, балады-прытчы, балады-казкі, балады-рэфлексіі, балады-думы, балады-песні, балады-споведзі, балады-партрэты і інш.

Балады могуць мець розную форму: яны могуць быць маналагічнымі, напісанымі ад імя непасрэдных удзельнікаў падзей (што бліжэй да лірыкі); дыялагічнымі, калі пры дапамозе дыялога развіваецца дзеянне, раскрываюцца характары герояў (блізкія да драмы); выяўленча-апісальнымі, дзе выяўляецца падзейны сюжэт (блізкі да эпасу).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Чаму ж паэт у сваіх творах звярнуўся да такога складанага жанру, як балада? Як ужо адзначалася вышэй, Янка Сіпакоў з поспехам сінтэзуе ў баладзе адзнакі найперш двух родаў літаратуры, у выніку чаго і нараджаецца яго **эпіка-лірычная разнавіднасць балады**. Амаль усё ў такіх творах пачынаецца з выразных і паўнаважкіх гістарычных замалёвак, якія ўключаюць у сябе акцэнтныя сцэны. Дзякуючы падобнаму прыёму пісьма, перад чытачом паўстае даволі свабодны і аб'ёмны малюнак і, па сцвярджэнні даследчыкаў, з'яўляецца дадатковае значэнне сюжэта, які трымаецца на прадметных сцэнах, эпізодах і карцінах. Сюжэт славенскай балады XX стагоддзя «Еш!» наступны: змучаныя голадам, знясіленыя ад цяжкай працы, фашысцкія вязні жывуць толькі марай пра Свабоду і таму цішком, каб не бачылі наглядчыкі, кормяць сваімі пайкамі таварыша, каб ён падужэў, змог перасіліць вартаўніка і дапамагчы ім уцячы на волю. Мы бачым, як вязні нясуць свае нескарыстаныя пайкі, як есць ён і чаўкае, а яны палохаюцца, каб гукаў гэтых не пачулі стражнікі, як і што яны думаюць, калі назіраюць за пераўтварэннем такога самага, як яны, вязня ў дужага чалавека. Кожная сцэна ў баладзе мае не толькі канкрэтны, але і абагульнены змест, працуе на надзею палонных – нягледзячы ні на што, уратавацца, але сюжэт не з'яўляецца адзіным «стрыжнем» твора, бо не меншую вартасць мае і тое, што прапушчана праз душы вязняў і набывае форму калектыўнага маналогу.

У гэтай баладзе фізічная смерць не паказана, але яна не мінуе вязняў, якія даведаліся, што кармілі здрадніка, падасланага стражнікамі. Паводле жанравага вызначэння, гэта балада-прытча, у якой скандэнсаваны вопыт горкага мінулага і аўтарскае разуменне складанасці жыцця.

Дзеянне-эпізод, дзеянне-сцэнка знаходзіцца і ў цэнтры гістарычнай балады ўсіх славян XY стагоддзя «Грунвальд», у аснову якой пакладзена адлюстраванне барацьбы паміж славянамі і крыжакамі і паражэнне апошніх. У гэтым творы характары персанажаў як бы «ўрастаюць» у сцэны і эпізоды, «высвечваюцца» ў выразных дэталях. За кошт сцэн, эпізодаў і дэталяў паэт здымае дыдактызм у творах баладнага жанру, не ўмешваецца ў апавяданне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У **эпічных баладах** ствараецца ўражанне поўнай адсутнасці аўтара, але гэта не так: аўтар, пакідаючы сам-насам і падзеі, і герояў, «раствараецца» ў тэксце, прымушае дзеянне самараскрывацца. Прыкладам падобнай манеры пісьма аўтара з’яўляецца балада «Падатак. Балгарская балада. XYI стагоддзе», заснаваная на рэальных гістарычных падзеях у Балгарыі, калі заваёўнікі для ўмацавання свайго становішча выхоўвалі мясцовых дзяцей на свой лад, адлучалі іх ад бацькоў.

Там дадуць адразу ім чужое імя:
Так прымусяць здрадзіць – без віны! – Радзіме.
А яшчэ навучаць ненавідзець люта
Бацькаўшчыну, дом свой, што даўно ў пакутах.

Падатак – гэта малыя балгарскія дзеці, якіх гадуюць чужынцы, выхоўваюць з іх ворагаў свайго краю, зямлі і радзімы. Аўтарская пазіцыя выяўляецца ўжо ў выбары падобнай жыццёвай сітуацыі, дадумваецца чытачом.

**Лірычныя** балады Янкі Сіпакова гучаць як унутраныя маналогі герояў. Іх кампазіцыя не перашкаджае разгортванню маральна-этычнага і сацыяльнага канфліктаў, развіццю «ўнутранага дзеяння», паказу барацьбы паміж сіламі дабра і зла.

Так, у баладзе «Чубы» толькі пяць пачатковых радкоў – больш-менш разгорнутае апісанне, гістарычная даведка пра нараджэнне бунту былых сялян, а цяпер казакоў супраць улад, а пасля ідзе ўнутраны маналог вольных людзей пра тое, што іх, вольных, хочуць зноў запрыгоніць. Урэшце рэшт драматычныя ўнутраныя перажыванні перарастаюць у бунт, пратэст:

– Не хочам вашай ласкі,
У нас свой парадак – наскі.

«Чубы» – твор, праз які праходзіць думка пра свабоду як натуральны, а рабства – як ненармальны стан чалавека. Што датычыцца жанравага вызначэння, дык гэта алегарычная балада-прытча, у якой абагульнены сэнс і вельмі выразная эталагічная аснова пададзены ў іншасказальнай, іранічнай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

травесційнай форме. Гэта балада-казка з мудрым выслоўем: «Хто раз адчуў смак волі, той будзе трымацца за яе ўсімі магчымымі спосабамі». У лірычных баладах Янкі Сіпакова героі не столькі дзейнічаюць, колькі мысляць, праходзяць выпрабаванне на духоўную трываласць. Яшчэ адна асаблівасць такіх вершаў – іх псіхалагізм і аналітызм.

Многія балады Янкі Сіпакова створаны ў адпаведнасці з патрабаваннямі **драматургічных** твораў: у іх аснове ляжыць востры канфлікт, матэрыял падаецца ў форме дыялогу.

Яскравым прыкладам падобнай разнавіднасці з'яўляецца балада «Разня», аснову якой складае размова маці і маленькага сына, з якой чытач даведваецца і пра жудасныя падзеі, і пра стаўленне да іх аўтара:

– Мамачка, мамка, чаму, паглядзіце,
Чырвоная рэчка такая?
– Сыне мой, сыне, у ёй не вадзіца –
То ж кроў наша, сыне, людская.

Звяртае на сябе ўвагу цікавая асаблівасць гэтага твора, як і многіх іншых балад Янкі Сіпакова, – паэт рэдка калі апісвае смерць герояў, а стварае «перадсмяротную сітуацыю», бо канец твора вядомы чытачу.

Але самыя па мастацку вартасныя балады нараджаюцца ў Сіпакова на аснове спалучэння трох спосабаў паказу рэчаіснасці: маналагічнага, дыялагічнага і апісальнага. Падобны сінтэз апавядальнасці, спавядальнасці і дзеяння сведчыць пра імкненне сучаснага мастацтва не толькі да жанравага «распаду», але і адраджэння ў ім сінтэтызму, пра вяртанне пад уплывам складаных падзей, «ушчыльненасці жыцця» да сваіх вытокаў, «спрадвечнай» (па-руску – изначальной) сутнасці. Янка Сіпакоў у баладзе «Пытанне» выкарыстоўвае адзнакі трох родаў літаратуры: лірыкі, эпасу, драмы, але робіць усё гэта лаканічна, сцісла, – і таму напружана, скандэнсавана і ў часе і ў прасторы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Усё вышэйсказанае падмацоўвае наш тэзіс пра «разамкнёнасць» жанравай структуры сённяшняй лірыка-эпікі і лірыкі, узбагачэнне і карыстанне найлепшымі дасягненнямі трох родаў літаратуры.

Янка Сіпакоў з аднолькавым поспехам карыстаўся рознымі класічнымі (сталымі, традыцыйнымі) жанрамі. Побач з трагедыйнай па змесце баладай у яго існуе і сумная, ціхая элегія, і гучная, заклікавая **ода**. Ода Янкі Сіпакова – амаль не даследаваная, але вельмі цікавая з’ява. З дапамогай гэтага жанру паэт змог ухваліць не толькі гераічныя ўчынкі і подзвігі людзей, але і даць выверaную, філасофска-значную ацэнку падзеям, засяродзіцца на агульначалавечых праблемах, узняць шчырыя чалавечыя пачуцці на адпаведную жанравай зададзенасці вышыню. Для прыкладу разгледзім верш паэта адычнага гучання «Жанчына спявае». Звычайна ў гонар кожнай жанчыны складаюць санеты, пішуць рыцарскія раманы, але вобраз маці часцей прысутнічае ў одзе. Я. Сіпакоў у сваім творы ўсхваляе жанчыну праз песню, якую тая спявае і якой абвяргае ўсе «крыўды і плёткі» і ўстанаўлівае гармонію ў свеце і ў душы: «Шануйма ж гэтак жанчыну, // Каб яна і ў будні спявала!». Верш гэты, безумоўна, адычны па сваім пафасе, настроі, падмацаваных клічнай інтанацыяй. Цікавая яго кампазіцыя: першая частка – апісанне, другая – непасрэдны зварот да чытача.

У паэта ёсць вершы, дзе ўрачыстасць інтанацыі, адычнасць гучання ствараецца паўторамі, паралелізмамі, паўзамі пасля першых слоў у радку. Іх можна назваць одамі «пошуку свайго месца ў жыцці»: «Поле – прагне абуджаных сонцам зярнят, // Вёска – новых, прарослых ля вуліцы хат. // Мая песня гукае свой сціплы народ, // Каб у ім прарасці хоць на дзень, хоць на год».

Многа ў паэта і одаў памяці, у якіх прыгадваецца мінулая Вялікая Айчынная вайна, славіцца подзвіг вядомых і невядомых герояў («Паранены партызан», «Каска»). Па сваім героіка-трагедыйным гучанні такія творы блізкія і да балады, і да элегіі, канцэнтруюць у сабе маштабны, шматгранны змест, сведчаць пра размыванне жанравых межаў у літаратуры нашых дзён.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ад падобнага жанравага сінтэзу ў такога роду творах назіраецца ўжыванне вялікай колькасці тропаў («Ах, блакада, – удаў валавокі!», «лес абмерзлы»), павышаная экспрэсіўнасць і найвышэйшага гатунку лірызм: паранены партызан, відаць, перасохлымі ад смагі і чорнай скрухі вуснамі просіцца – «Я адзін... // Падпаліце снягі, падпаліце снягі!».

**Прытчавымі** з’яўляюцца многія творы Янкі Сіпакова. Прыгадаем некаторыя з іх. «Скарга прыручанага ваўка» – баладны верш пра страчаную свабоду, пра жыццё на волі, якое немагчымае ў канкрэтных умовах, калі ці не самы вольналюбны звер апынуўся ў звярынцы ў клетцы і – што яшчэ больш жахліва – пастаўлены насупраць зайца, што выскаляецца з вечнага ворага свайго, цяпер нявольніка. Прытчападобныя і творы паэта, якія ўвайшлі ў кнігу «Веча славянскіх балад», – пра духоўную смерць людзей, што здраджваюць сваім караням, традыцыям, забываюцца на сваё імя, на свой народ. Кніга ў цэлым – пра адзінства і смеласць як выклік ворагам, пра супольнасць як форму выжывання ў экстрэмальных умовах. Такая выснова большасці балад са знакамітай кнігі пісьменніка.

Янка Сіпакоў надаў новае дыханне **санету**, адрадзіў яго класічныя прынцыпы пабудовы і сімволіку. Шматгранны талент мастака-творцы праявіўся ў выдатных паэтавых санетах. Да Я. Сіпакова санеты пісалі і славутыя майстры (Дантэ, Шэкспір, Міцкевіч, Багдановіч, Купала, Куляшоў, Танк). Значны ўклад у станаўленне беларускай санетыстыкі ўнеслі паэты-эмігранты Алесь Салавей і Міхась Кавыль – аўтар асобнай кнігі твораў гэтай формы верша «Цяжкія думы». Але паэт – прадстаўнік «філалагічнага пакалення» не згубіўся сярод прызнаных і непрызнаных аўтарытэтаў і стварыў свой «санетны свет».

Разгледзім верш Янкі Сіпакова «Санет кахання». Ён напісаны пяцістопным ямбам, але ў ім сустракаюцца шасці- («Чаго саромецца, – ты ж у маім санеце...») і сямістопны ямб («Ты не саромейся мяне. Бо ты адна, лічы...»), што надае вершу рытмічную свабоду і акцэнтуе ўвагу рэцыпіента на іх. У катрэнах, якіх у вершы тры, паэт гаворыць пра імкненне захаваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цнатлівую каханую ад цынікаў, а ва ўсечаным двухрадковым тэрцэце робіць вывад пра тое, што яна надзейна абаронена самой санетнай магіяй:

І я заўсёды буду берагчы
Тваю цнатлівасць светлую аддана.
Ты не саромейся мяне. Бо ты адна, лічы,
Тут, у санеце, беражна схавана.

Хоць гэты санет і напісаны нетрадыцыйна (у ім спалучаюцца пяці-, шасці-, і сямістопны ямб, апошняе слова ў ім не мае той вагі, якую павінна было б мець), але ў цэлым адпавядае класічным канонам: у ім не паўтараюцца адны і тыя ж словы, хіба толькі аднакарэнныя ды займеннікі. Гэта як бы шэкспіраўскі санет навыварат: трохрадкоўе і чатырохрадкоўе мяняюцца месцамі.

Але самым вялікім дасягненнем паэта ў санетатворчасці з'яўляецца яго вянок санетаў «Жанчына» з кнігі «У поўдзень, да вады...» – вельмі цяжкая цыклічная форма, якая патрабуе ад паэта велізарнай вынаходлівасці і майстэрства, дасканалага валодання словамі, рытмікай, сістэмай рыфмоўкі і законамі вершаскладання. «Вянок санетаў – вершаваны твор з пятнаццаці санетаў. Своеасаблівасць яго ў тым, што паўтарэннем асобных радкоў усе чатырнаццаць санетаў звязаны паміж сабой, а таксама з магістралам – пятнаццатым, заключным санетам, які складаецца з першых радкоў папярэдніх санетаў. Кожны наступны санет пачынаецца радком, якім заканчваецца папярэдні. Чатырнаццаты санет завяршаецца радком, якім пачынаецца першы. Гэты ж радок пачынае і магістрал. Такім чынам ствараецца арыгінальнае архітэктанічнае кальцо»[3].

У сваім вянку санетаў паэт узняў жанчыну на высокі п'едэстал гонару, ахінуў яе не адцягнена-абстрактным, а канкрэтным, зямным арэолам святасці і прыгажосці, пакланіўся ёй, як Маці, Каханай, Жонцы. У «Вянку санетаў» паэт захаваў чысціню жанравай формы санета, вытрымаў кананічную лічбу чатырнаццаць: кожны санет складаецца з чатырнаццаці радкоў (двух

[3] Рагойша В.П. Паэтычны слоўнік.- 2-е выд., дапрац. і дапоўн.-Мн.,1987.-С.321.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

катрэнаў па чатыры радкі і двух тэрцэтаў па тры радкі). Увесь цыкл складаецца з чатырнаццаці санетаў і заканчваецца своеасаблівай высновай – «Магістраллю», што складаецца з усіх першых радкоў папярэдніх санетаў. Цыкл напісаны традыцыйным для санетаскладання пяцістопным ямбам, у ім два італьянскія адкрытыя катрэны (абаб абаб) і два французскія тэрцэты (ввг ддг):

Ад рук, ад вуснаў, ад вачэй тваіх
Пачуўся свет – ласкавы і пакорны.
А што было, скажыце мне, да іх
У заінелай з нелюбі прасторы?

Цыкл санетаў «Жанчына» ўяўляе сабою не проста падбор санетаў, створаных паэтам і аб’яднаных агульнай тэмай, а адлюстроўвае яго задуму паказаць саму жанчыну і яе жыццё не статычна, а ў развіцці, у руху ад пасылкі да высновы. Таму кожнаму санэту можна даць назву, што злучыць яго з наступным і папярэднім: «Сустрэча» – «Саюз двух» – «Дабрыня» – «Мадонна» – «Цяжкі крыж маці» – «Шматаблічнасць» – «Нязгасная прыгажосць» – «Пакланенне» і г.д.

Завяршае свой вянок санетаў Янка Сіпакоў «Магістраллю» (правільна – «магістрал»). Пішацца такі верш раней за іншыя санеты, але паколькі стаіць пасля іх, то ствараецца ўражанне яго раптоўнага і ненаўмыснага самаўзнікнення. Магістрал вызначае ідэйную задуму ўсяго вянка санетаў, таму павінен быць выразным па выказанай думцы, дасканалым па форме.

Як ужо адзначалася, Янка Сіпакоў – мастак, схільны да філасафізму і псіхалагізму, ён пастаянна знаходзіцца ў пошуках, і яго творчасць – арыгінальная з’ява нашага часу. Гэтыя акалічнасці акрэсліваюць выбар паэтам жанраў, жанравых і вершаваных формаў. Побач з выдатнымі творамі традыцыйных класічных жанраў ён удала выкарыстоўвае верлібр.

У сваім артыкуле «Імем натхнення» Янка Сіпакоў адзначае: «Калі ў вашым вершы няма стройнай вобразнай сістэмы, адзінай цэласнай думкі, спрасаванай вялікім пачуццём, паспрабуйце тады адмовіцца ад звыклага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рытму і звыклай рыфмы. І вы ўбачыце, як, здавалася б, звонкі верш адразу рассыплецца. У вольным вершы ўсё на віду. І тыя недахопы, якія ў іншым вершы маглі б схавацца за звонкую рыфму, тут бачны адразу: і кволасць вобразаў, і вяласць думкі, і несуладнасць мелодыкі»[4].

Значыць, напісаць свабодны верш значна складаней, чым класічны, бо трэба выкарыстоўваць усё тое, што нясе эстэтычную функцыю. І галоўная кампенсацыя ідзе не столькі за кошт насычанасці розных сродкаў эўфаніі, як за кошт глыбокай думкі, філасофскага пранікнення ў рэчаіснасць. Усё пералічанае ёсць у наступным верлібры Янкі Сіпакова:

А зямля,  
Відаць, таму і круглая,  
Каб ніхто  
Не мог сесці ў цэнтры  
Ці ў якім зручным кутку  
І пагардліва сказаць іншым:  
– Мы – абраны Богам народ,  
– А вы – нашы рабы…

Верш напоўнены значным філасофскім зместам: аўтар у алегарычнай форме раскрывае нядаўнюю трагедыю, калі фашысцкія ідэолагі заклікалі да знішчэння ўсіх народаў і прапагандавалі сваю расавую чысціню. Паэт удала карыстаецца свабодным вершам для выражэння філасофскай задумы, замяняючы звыклую рытміку і метрыку важкімі інтанацыйнымі паўзамі, незакончанасцю, перарывістасцю роздуму і ўжываннем у апошнім сказе клічнай канструкцыі. Увесь верш прасякнуты скразной думкай – напамінам чалавецтву пра крывавыя трагедыі і заклікам да немагчымасці паўтарэння падобнага.

Верлібрам напісаны амаль усе вершы цыкла «Раскальцаваныя птушкі» з кнігі «У поўдзень, да вады…». Найчасцей выкарыстоўвае яго паэт для

[4] Сіпакоў Я. Імем натхнення // Дзень паэзіі. – 1966. – С.91.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

твораў на гістарычную тэматыку з трагедыйным пафасам («Вайна», З успамінаў», «Гледзячы на даўні здымак»).

Свабодны верш, паводле меркавання паэта, лепш за ўсё перадае філасафічнасць і медытатыўнасць, выяўляе важкую аўтарскую думку, будуецца такі твор на аснове кантрасту з ужываннем магчымых сродкаў кампенсацыі традыцыйнай метрыкі і рытмікі (сэнсавага і інтанацыйнага члянення твора, аднатыпных сінтаксічных канструкцый, слоў, багацця сімволікі, тропаў, умоўна-вобразнай асацыятыўнасці).

Такім чынам, у адрозненне ад іншых прадстаўнікоў «філалагічнага пакалення» Янка Сіпакоў больш засяроджаны на гістарычнай праблематыцы і тэме будучыні, мае выразны эпічны склад мыслення, а таму і значна часцей звяртаецца да жанру балады, прытчы, верлібра як спосабу перадачы маштабных думак, абмалёўкі панарамных карцін, стварэння шырокага палатна шматгалосага жыцця. У творчасці паэта пераважаюць апісанне, карціна, сюжэтная сцэнка, слова выконвае функцыю «малявання», бруіцца и пераліваецца сэнсавымі адценнямі (чым ён вельмі падобны да Р.Барадуліна), а гармонія пераадольвае асіметрычны пачатак нават у самых трагедыйных творах.

Я. Сіпакоў у другой палове 1980-х – пачатку 2000-х г. як бы не вытрымлівае «імпульсіўнасці і сцэнічнасці» паэзіі і паступова пераходзіць да адлюстравання падзей і праяў аб’ектыўнага свету ў эпасе. Пошукі ў жанравых межах апавядання адбыліся ў наступных кнігах Я. Сіпакова «Спадзяванне на радасць» (1983) і «Пяць струн» (1984), «Журба ў стылі рэтра» (1990), «Тыя, што ідуць» (1993), «Вецер на даху вагона» (2003), якія засведчылі «эпізацыю» таленту пісьменніка. Пісьменнік звяртаецца да жахлівага нядаўняга мінулага і драматычнага сённяшняга дня, выкарыстоўвае таксама форму свабодных запісаў па набалелых пытаннях жыцця ўвогуле («Журба ў стылі рэтра»). У кнізе прытчаў «Тыя, што ідуць» жыццё паўстае ва ўсёй разнастайнасці сваіх праяў, у якім пераплецены

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рэальнае і ірацыянальнае, жыццёвае і прывіднае, адчуваецца іх глыбокая сімвалічная насычанасць.

І ў прозе Я. Сіпакоў шмат у чым застаецца паэтам, яго апавяданні прасякнуты лірычным хваляваннем, эмацыянальнай настроенасцю, узнёсласцю думкі, што ўласціва паэзіі, рухаючым элементам у іх з’яўляюцца эмоцыя, пачуццё. Асэнсоўваючы чалавечыя лёсы, аўтар суперажывае іх, выказвае ўласныя адносіны да рэчаіснасці. Большасць прытчаў Я. Сіпакова сюжэтна арганізавана, ім уласціва дынамічнае, напружанае дзеянне, філасофскія развагі.

Кніга паэм у прозе «Ахвярны двор» (1991) вызначаецца скіраванасцю да жахлівых трагедый XX века – землятрусу ў Арменіі і Чарнобыльскай катастрофы, а таксама да драматычнага лёсу Т. Шаўчэнкі і лёсу Абхазіі, да ўражанняў ад наведвання пушкінскага Міхайлаўскага, яе складаюць паэмы ў прозе «Хата», «Ахвярны двор» і інш. Трагедыйнай напружанасцю вызначаецца паэма «Одзіум» пра Чарнобыльскую бяду. Вобразы Катаклізму, Апакаліпсісу, Катастрофы – сімвалы сілаў Зла, несправядлівай кары. Голас паэта звернуты да Бога з верай у заступніцтва, у паратунак народа Беларусі. Ва ўсіх паэмах з кнігі адчуваецца моцны публіцыстычны элемент – вынік неабыякавасці да жыцця пісьменнікі, калі трагедыя стала ўнутраным болем паэта.

Паэму “Одзіум” можна прааналізаваць па схеме, змешчанай у іэме “Анатоль Вярцінскі”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Пытанні і заданні:**

1. Чаму элегіі Я.Сіпакова можна назваць маштабнымі па змесце? Сваю думку абгрунтуйце.

2. На якія тры групы можна падзяліць элегіі Янкі Сіпакова, адказ абгрунтуйце. Прааналізуйце адну элегію паэта на выбар.

3. У чым заключаецца жанравая адметнасць балады? Які зборнік паэта складаецца толькі з балад.

4. Сасастойна прачытайце балады паэта «Чубы», «Падатак» і «Разня». У чым іх адрозненне?

5. Чаму оду Я.Сіпакова называюць амаль не даследаванай з’явай? Прааналізуйце оду Я.Сіпакова «У гасцях».

6. Што такое прытча? Якія вершы прытчавага гучання Янкі Сіпакова вы ведаеце? Прааналізуйце адзін з іх.

7. Чаму Я.Сіпакова называюць майстром санетаў? Што такое вянок санетаў?

8. Што такое верлібр? Якія верлібры Я. Сіпакова вы ведаеце?.

9. Які жанр пераважае ў творчасці паэта і чаму?

10. Ахарактарызуйце жанравую разнастайнасць лірыкі Я.Сіпакова. Параўнайце жанравую палітру творчасці майстра слова з жанравай палітрай альбо В.Зуёнка, альбо А.Вярцінскага.

## Дадатковая літаратура


1. Арочка, М. Паэзія // М. Арочка, Г. Дзюбайла, С. Лаўшук. На парозе 90-х. / М. Арочка. – Мінск, 1993.
2. Бельскі, А.І. Паэзія // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя. Т. 4. Кн. 2: 1986 – 2000 / А.І. Бельскі. –Мінск, 2003. – С. 39 – 87.
3. Бельскі, А.І. Сучасная беларуская літаратура: Станаўленне і развіццё творчых індывідуальнасцей (80 – 90-х гг.): Вучэбна-метадычны дапам. для настаўнікаў / А.І. Бельскі. – Мінск, 1997.
4. Гарэлік, Л.М. Эстэтыка гарманічна-кантрастнага адлюстравання свету ў сучаснай беларускай паэзіі / Л.М. Гарэлік // Сучасная літаратура: каардынаты ідэйна-мастацкага пошуку / С.А. Андраюк і інш.; навук рэд. В.М. Стральцовай. – Мінск, 2008.
5. Гніламёдаў, У. Сучасная беларуская паэзія / У. Гніламёдаў. – Мінск, 1983.
6. Кавалёў, С. Як пакахаць ружу: Літаратурна-крытычныя артыкулы пра маладую беларускую паэзію 80-х гадоў / С. Каалёў. – Мінск, 1989.
7. Кавалёў, С. Партрэт шкла / С. Кавалёў. – Мінск, 1991.
8. Кісліцына, Г. Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы / Г. Кісліцына. – Мінск, 2006.
9. Мішчанчук, М.І. Ёсць у паэта свой аблог цалінны: Жанрава-стылявая разнастайнасць сучаснай беларускай лірыкі М.І. Мішчанчук. – Мінск, 1992.
10. Тычына, М. Лекі ад амнезіі. Сучасная тэматыка ў сучаснай літаратуры / М. Тычына // Роднае слова. – 1994. – № 4, 6.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ